ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 16 (1031) | Субота, 16 красавіка 1955 года | Цана 50 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Першая старонка.

Перадавы. — Вялікія традыцыі.

Э. Чачко. — Праца ў імя міру.

Чакаем новых п'ес!

Другая старонка.

Я. Брыль. — Праз казачнае акно.

Я. Рамановіч. — Самадзейныя спектаклі.

М. Пігулеўскі. — Павышаць культуру спявання.

Трэцяя старонка.

Вл. Маякоўскі. — Пасланне пролетарскім паэтам.

Н. Асееў. — Маякоўскі аб сабе.

А. Вялюгін. — Праз глыбы гадоў.

Д. Кавалёў. — Жывы з жывымі.

Чацвёртая старонка.

Т. Хадкевіч. — Старонкі незабыўнай барацьбы.

В. Ждан. — Маладыя мастакі.

І. Барысаў. — У змаганні за праўдзівае слова.

Вялікія традыцыі

Дзяўчына купляе літаратуру для калгаснай бібліятэкі: «Абавязкова дайце Маякоўскага!»

Кнігі паэта набываюць пажылы рабочы і бязвусы студэнт, патрабуюць маленькія першакласнікі, якім трэба разабрацца ў тым, што такое добра, а што такое дрэнна. Маякоўскага чытаюць на многіх дзесятках моваў нашай Радзімы. Яго кнігі ніколі не залежваюцца на паліцы. Гэта — кнігі жывога паэта.

Ён стаў другам чылійскіх рудакопаў, парыжскіх металістаў, жыхароў рабочых украін Стамбула. Яго радкі, надрукаваныя іерогліфамі, чытаюць грамадзяне вялікага свабоднага Кітая. Яго выдавалі ў джунглях байцы гераічнай Народнай Арміі В'етнама. Маякоўскі працягвае падарожжа вакол свету, якое не завяршыў пры жыцці.

І калі пры жыцці яго слухалі і чыталі тысячы, цяпер яго ведаюць мільёны. Гэта пераможнае шэсце той вялікай справы, якой была аддадзена ўся звонкая сіла паэта. І чым бліжэй да нас «комуністычнае далёка», аб якім так горача марыў і за якое змагаўся вялікі паэт, тым больш патрэбна людзям яго слова.

Сапраўдная паэзія, сапраўднае мастацтва заснаваны на гуманізме, нараджаюцца з любві да людзей працы. Маякоўскі быў першым з вялікіх паэтаў, які стаў побач з Горкім, які знайшоў канкрэтнае выяўленне свайго гуманізма ў комуністычнай партыйнасці.

Словы пра «сто тамоў партыйных кніжак» — дакладны вынік усяго яго магутнага і яскравага творчага жыцця. Комуністычная партыйнасць — сутнасць яго асобы, яго паэзіі, усёй яго велізарнай работы на карысць Радзімы, барацьбы за новую социялістычную культуру.

Маштабы яго дзейнасці велізарныя. Вершам і п'есай, эстрадным выступленнем і плакатам ён служыў рэволюцыі. Ён быў салдатам рэволюцыі, калі пісаў аб жыцці Владзіміра Ільіча і аб штурме Зімняга і калі пісаў пра сваё каханне. У яго творчасці няма мяжы паміж адносінамі да свайго інтымнага і да агульнага, усенароднага. Пра рэволюцыю ён сказаў—«Мая рэволюцыя», а кахання ён хацеў такога, «каб уся, на першы крык: Таварыш! — паварочвалася зямля». І да дробязі і да вялікага ў жыцці ён адносіўся, як комуніст.

Іменна з такіх партыйных адносін да жыцця і нараджалася дакладнае, яснае ўсведамленне месца паэта ў рабочым страі.

Паэт для Вл. Маякоўскага — рабочы, будаўнік новага жыцця. Але паэт не толькі стаіць у рабочым страі. Маякоўскі разумеў, што пераплаўленая ў паэзію «слоўная руда» «прыводзіць у рух тысячы год мільёнаў сэрцы».

Для Маякоўскага паэт — «народа вадзіцель і адначасова — народны слуга». Гэта класічнае вызначэнне ролі і месца паэта-мастака ў совецкім грамадстве.

Ён заўсёды быў там, дзе слова паэта было неабходна ў дадзены момант. Патрэбная партыі і рэволюцыі тэма была «сваёй тэмай» Маякоўскага, яна прыходзіла па загаду сэрца.

З якой энергіяй, актыўнасцю, працавітасцю ўвасабляўся гэты загад у выдатныя творы паэзіі. Вось вытрымка з яго пісьма ў Дзяржвыдат у 1929 годзе:

«Сярэдняя колькасць маёй гадавой літаратурнай прадукцыі такая: том збору твораў каля 20 аркушаў. Паэма каля 3500 радкоў. Проза каля 6 аркушаў. Дзіцячыя кнігі і агітбрашуры».

Да гэтага трэба яшчэ дадаць рэкламы, ілюстрацыі, якія паэт часта рабіў для сваіх агітбрашур, рэдактарскую работу, шматлікія выступленні і паездкі, вялікую грамадскую работу. Маякоўскі быў не толькі вялікім талентам, але, падобна Горкаму, і вялікім працаўніком літаратуры.

Сярод многіх тысяч яго радкоў няма ніводнага, які быў-бы зроблены з халодным сэрцам, на поўсілы, без максімальнай добрасумленнасці майстра. І маленькая агітка і вялікая паэма — усё гэта зброя рэволюцыі, а зброя павінна быць безадмоўнай. Маякоўскі пастаянна вастрыў сваю зброю, увесь яго творчы шлях — няспынное ўдасканаленне. «Пра гэта» — адзін з выдатных у сусветнай паэзіі твораў аб каханні — «рэч найбольшай і найлепшай апрацоўкі». Аднак паэма «Владзімір Ільіч Ленін» яшчэ больш цудоўная, яшчэ больш дасканалая. Здаецца, нельга дасягнуць большай адточанасці, выразнасці слова, чым гэта дасягнута ў «Добра!». Але якімі алмазнымі гранямі зяе «На ўвесь голас»!

Не заспакойвацца на дасягнутым, не стаяць на месцы, «пераступіць цераз самога сябе», каб узняцца на новую вышэйшую ступень — вось што было творчым дэвізам Маякоўскага. Без няспынных смелых пошукаў і парываннаў ён не ўяўляў сабе жыцця ў літаратуры ні для сябе, ні для другіх.

Ён пісаў: «Я асабіста па двух жанравых крытэрыях правяраю свае вершы:

Калі ўстануць з магіл усе паэты, яны павінны сказаць: у нас такіх вершаў не было, і не ведалі, і не ўмелі.

Калі ўстане з магілы мінулае — белыя і рэстаўрацыя, мой верш павінны знайсці і знішчыць за поўную для белых шкоднасць.

Прапорцыя гэтых момантаў — прапорцыя якасцей верша».

Маякоўскі быў найвялікшым наватарам паэзіі, бо ён паэт партыі комуністаў, якую яшчэ Энгельс называў партыяй наватараў.

Вось чаму пры ўсёй рознастайнасці нацыянальных паэтычных традыцый, пры ўсёй рознасці індывідуальных стылевых асаблівасцей для ўсіх «добрых і розных» совецкіх паэтаў, для прагрэсіўных паэтаў Усходу і Захаду Маякоўскі — лепшы з лепшых настаўнікаў.

Маякоўскі не любіў юбілеяў. Але мы ўсенародна адзначаем гэтае дваццаціпяцігоддзе не для таго толькі, каб добрым словам ушанаваць памяць паэта. Ды і якія словы можна дадаць да таго, што ён сам аб сабе сказаў:

Мне напляваць
на мармуру шматпуддзе,
мне напляваць
на бронзавую слізь.
Падзелім славу нейк, —
усе-ж свае мы людзі,
няхай нам
помнікам агульным будзе
збудованы
ў баях
социялізм.

Для ўсіх мастакоў слова, дзеячоў совецкага мастацтва, творчы подзвіг Маякоўскага — цудоўны ўзор вернасці сваёй справе, прынцыповасці, смеласці, актыўнасці мастака. Хай сёння паэты праверацъ свае рады: ці ўсе трымаюць раўненне па правафланговаму, ці ўсе ідуць у нагу з часам, ці не пляцецца хто ў хвасце падзей?

Быць заўсёды наперадзе, усімі сіламі дапамагаць нашай партыі ў яе велічнай стваральнай рабоце — вось найпершая, найгалоўнейшая традыцыя Маякоўскага.

Барацьба, якую цяпер вядзе наша партыя, наш народ за далейшае развіццё цяжкай прамысловасці, за круты ўздым сельскай гаспадаркі, гэтая барацьба мае патрэбу і ў баявым паэтычным слове. І натхнёныя вострыя радкі на тэму дня, і баявыя нарысы, і подпісы да плакатаў, побач з вялікімі творамі — усё гэта магутная дапамога вялікай справе, якой цяпер заняты наш народ. Такая актыўная работа нашых пісьменнікаў была-б лепшым працягам цудоўнай традыцыі вялікага совецкага паэта.

Трэба з усёй шчырасцю прызнаць, што нашы паэты, пісьменнікі не змаглі яшчэ належным чынам адказаць на гэта настойлівае патрабаванне жыцця. Ні аднаго нумара газеты без баявога паэтычнага слова!—вось дэвіз, варты спадчыннікаў «агітатара, гарлана — главара».

Зрабіць сваё мастацтва вернай і спраўнай зброяй народа — вось вялікая традыцыя Маякоўскага. Кіравацца гэтай традыцыяй — значыць няспынна ўдасканальваць майстэрства, значыць ніколі не заспакойвацца, не баяцца смелых імкненняў і творчых пошукаў.

Нямала ў нас яшчэ твораў бледных і бяскрылых. Часам у нашых часопісах цяжка бывае адрозніць паэтаў. А ў Маякоўскага кожны новы твор ужо не падобны на папярэдні. Маякоўскі, гаворачы аб мастацкай форме, не баяўся ўжываць слова «вынаходніцтва». Скаванасць, баязлівасць формы заўсёды спадарожнічае абмежаванасці, беднасці мастацкага асэнсавання жыцця.

Творчую смеласць, якой адзначаны кожны крок Маякоўскага ў мастацтве, ён завяшчаў нам. Кіравацца яго традыцыяй, значыць не баяцца спаборнічаць нават з ім самім.

Кіравацца яго традыцыямі, гэта значыць быць заўсёды на перадавых пазіцыях жыцця, прыносіць сваім мастацтвам найбольшую карысць народу, смела ўмешвацца ў жыццё, каб ствараць творы, патрэбныя нашай вялікай партыі, вартыя нашага слаўнага народа.

Памяці паэта

Совецкі народ шырока адзначае дваццаціпяцігоддзе з дня смерці вялікага паэта Владзіміра Владзіміравіча Маякоўскага.

Творы паэта, паводле даных Усесаюзнай кніжнай палаты на 1-га красавіка гэтага года, выдаваліся ў Совецкім Саюзе 617 разоў, агульным тыражом 24.607 тысяч экземпляраў на 56 мовах народаў СССР і зарубежных краін.

На прадпрыемствах, у клубах, бібліятэках, вышэйшых навучальных установах краіны ў гэтыя дні праходзяць літаратурныя вечары, арганізоўваюцца лекцыі і выстаўкі, прысвечаныя жыццю і дзейнасці В. Маякоўскага.

12 красавіка закончыліся чытанні ў Інстытуце сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага Акадэміі навук СССР, дзе былі заслуханы даклады выдатных совецкіх вучоных-літаратуразнаўцаў аб творчасці В. Маякоўскага.

Цэнтральны Дом работнікаў мастацтва СССР, Дзяржаўная бібліятэка-музей В. Маякоўскага і Маскоўскі тэатр, які носіць імя паэта, правялі літаратурна-мастацкі вечар, прысвечаны вялікаму паэту.

Да 85-й гадавіны з дня нараджэння В. І. Леніна

Лекцыі і даклады аб вялікім правадыру

Міністэрства культуры Беларускай ССР зацвердзіла план мерапрыемстваў па правядзенню 85-й гадавіны з дня нараджэння В. І. Леніна.

З 17 па 22 красавіка ў гарадах, раённых цэнтрах, у сельскіх населеных пунктах арганізуецца шырокі паказ мастацкіх і хранікальна-дакументальных фільмаў, прысвечаных В. І. Леніну. Гледачам будуць паказаны кінофільмы «Ленін у Кастрычніку», «Ленін у 1918 годзе», «Чалавек з ружжом», а таксама дакументальныя кінофільмы пра Леніна.

Работнікі культасветных устаноў арганізуюць на прадпрыемствах, ва ўстановах, у вёсках, у калгасах, МТС, соўгасах чытанне лекцый і дакладаў аб жыцці і дзейнасці В. І. Леніна — «В. І. Ленін — вялікі карыфей рэволюцыйнай навукі», «Вучэнне марксізма-ленінізма аб перамозе комунізма», «В. І. Ленін аб комуністычнай маралі» і на іншыя тэмы.

Вялікую работу правядуць работнікі бібліятэк. Арганізуюцца выстаўкі літаратуры, прысвечанай жыццю і дзейнасці В. І. Леніна, чытанні мастацкай літаратуры, мастацкія вечары, дзіцячыя ранішнікі.

Галоўнае ўпраўленне радыёінфармацыі наладжвае перадачы з Ленінскага раёна сталіцы аб развіцці прамысловасці і росце культуры гэтага раёна, а таксама з міжрэспубліканскай гідраэлектрастанцыі «Дружба народаў», з калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна.

Будзе арганізаваны радыёрэпартаж з універсітэта імя В. І. Леніна, з доміка 1-га з'езду РСДРП, з Мінскага Палаца піянераў.

Работнікі мастацтва горада Мінска рыхтуюць спецыяльную праграму канцэрта з музычных твораў, прысвечаных В. І. Леніну.

Выстаўкі ў бібліятэках

Свята ўшаноўваюць памяць Владзіміра Ільіча Леніна працоўныя Гомельшчыны. Да 85-годдзя з дня нараджэння вялікага правадыра працоўных абласная бібліятэка, якая носіць яго імя, зрабіла вялікую літаратурную выстаўку. На стэндзе — творы В. І. Леніна, мастацкая і палітычная літаратура, творы дзеячоў Комуністычнай партыі і Совецкай дзяржавы.

Выстаўкі твораў В. І. Леніна адкрыты ў бібліятэках завода «Гомсельмаш», шклозавода імя Сталіна, Палаца культуры гомельскіх чыгуначнікаў і іншых культурна-асветных установах.

У лекторыі пры кінотэатры імя Калініна для працоўных горада будзе прачытана лекцыя аб жыцці і рэволюцыйнай дзейнасці В. І. Леніна і паказан фільм «Ленін у Кастрычніку».

В. СЯМЕНАЎ.

Хроніка культурнага жыцця

ВЕРШЫ КАРЭЙСКІХ ПАЭТАЎ НА РУСКАЙ МОВЕ

«На варце міру» — пад такім загалоўкам у Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы выйшаў на рускай мове зборнік вершаў карэйскіх паэтаў.

У зборнік увайшлі творы, у якіх услаўляецца гераічная барацьба карэйскага народа за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы, за светлую будучыню, за мір ва ўсім свеце.

Тут змешчаны вершы Пак Мун Се, Кім Эн Чэр, Кім Сун Сек, Пак Се Ен, Лі Мяк і іншых. Выдадзены зборнік выдавецтвам дэпартамента культурнай сувязі з заграніцай Міністэрства культуры і прапаганды КНДР.

Зборнік «На варце міру», у ліку іншай літаратуры з Карэі, нядаўна атрыманы Беларускім таварыствам культурнай сувязі з заграніцай.

МАСТАЦКАЯ ПАСУДА

У магазінах Барысава і раёна можна бачыць керамічную гаспадарчую пасуду. Гэта — прадукцыя арцелі «Чырвоны Кастрычнік». На яе вялікі попыт спажыўцоў.

Сёлета калектыў арцелі значна пашырае выраб новага асартыменту прадукцыі. Толькі за апошні час асвоена дзевяць відаў новых высокамастацкіх вырабаў глазурнага роспісу, як, напрыклад, графіны, чайнікі, малочнікі і інш. Арцель прыступіла да масавага іх выпуску. Нядаўна пачалі выробляць пяць новых відаў статуэтак.

Для вырабу высокаякаснай пасуды глазурнай размалёўкі адкрыты новы цэх у г. Івянец Маладзечанскай вобласці, які славіцца сваімі майстрамі па вырабу керамікі.

К. ГЛУШАНІН.

НОВЫ ДОМ КУЛЬТУРЫ

У Віцебску адкрыўся Гарадскі Дом культуры. У ім ёсць добра абсталяваныя глядзельная зала на 400 месц, пакой для гурткавай работы.

Пры Доме культуры арганізаваны харавы, драматычны, танцавальны гурткі, адкрыты курсы крою і шыцця. У гуртках займаецца 200 чалавек.

Днямі мастацкая самадзейнасць Дома культуры дала першы канцэрт. Драмгурткоўцы разам з хорам выступілі з літаратурна-музычнай кампазіцыяй Александра Каваленкава «Двое ў дарозе», самадзейныя танцоры выканалі беларускую польку, рускія і венгерскія танцы.

Цяпер драматычны калектыў Дома культуры рыхтуецца да пастаноўкі п'есы В. Сабка «За другім фронтам», якую пакажа ў першамайскія дні.

Ф. РАСКАЗАЎ,
мастацкі кіраўнік Віцебскага гарадскога Дома культуры.

АСАБІСТЫЯ БІБЛІЯТЭКІ

У Жалудоцкім раёне многія старшыні калгасаў і спецыялісты сельскай гаспадаркі маюць асабістыя бібліятэкі. Так, напрыклад, бібліятэка старшыні калгаса імя Леніна Екацярыны Ульянаўны Кавальчук налічвае каля 1000 кніг, сярод іх—Сельскагаспадарчая энцыклапедыя, творы Мічурына, Глінскіх, Вільямса і іншыя.

Багатыя ўласныя бібліятэкі маюць зоатэхнік калгаса імя Будзённага тав. Шатаў, аграном калгаса імя Варашылава тав. Шарстнёў, дырэктар Дуброўскай МТС тав. Вайцёнак і іншыя.

І. МЕСНІКАЎ.

Чакаем новых п'ес!

Адкрытае пісьмо ад калектыву тэатра імя Я. Коласа беларускім драматургам, празаікам, паэтам

Дарагія таварышы!

Дэкада беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве дае нам права ганарыцца дасягненнямі нашых майстроў культуры. Гэтыя дасягненні сведчаць аб высокім узроўні іх творчага жыцця і, разам з тым, дазваляюць нашаму народу спадзявацца і патрабаваць ад тэатраў і літаратараў яшчэ большых намаганняў у стварэнні высокаідэйных і дасканалых па майстэрству сучасных п'ес розных жанраў.

На жаль, пасля дэкады тэатры асабліва востра адчулі трывожнае становішча з беларускай драматургіяй. Каб скарыстаць ўздым у сувязі з дэкадай, для далейшага росту нашых калектываў, для стварэння спектакляў на ўзроўні дэкадных неабходны добрыя п'есы. Агульныя поспехі беларускай літаратуры дазваляюць верыць, што нашы драматургі здольны пісаць тое, што патрэбна народу. Аднак некаторае заціншша ў іх творчасці прымушае нас вельмі хвалявацца за лёс тэатраў, якія не маюць цяпер новых п'ес нацыянальнай драматургіі.

Трэба-ж прызнаць той горкі факт, што ў рэпертуарных планах беларускіх тэатраў амаль адсутнічаюць п'есы нашых драматургаў. Набліжаюцца летнія гастролі, і мы вымушаны будзем паказваць свае, няхай часам і добрыя, але старыя, заіграныя спектаклі.

Мы ведаем, таварышы пісьменнікі, што вашай творчасці вельмі перашкаджаюць розныя староннія абавязкі: служба, пасяджэнні, прадстаўніцтва і г. д., якія адбіраюць многа часу ад прамога прызначэння пісьменніка. Вядома, што некаторых з вас спасцігаюць і няўдачы, і п'есы, напісаныя вамі, часам не бачаць святла рампы. Мы бярэм на сябе віну за не заўсёды чулыя, уважлівыя адносіны да п'ес беларускіх пісьменнікаў.

Мы хочам гэтым пісьмом напомніць таксама і праўленню Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР не толькі аб адставанні драматургіі, але і аб неабходнасці прыняць усе меры да таго, каб ліквідаваць гэта адставанне, узняць энергію пісьменнікаў, забяспечыць ім сапраўдныя ўмовы, пазбавіўшы ўсяго таго, што перашкаджае творчасці.

Дарагія нашы сябры!

Кандрат Кандратавіч Крапіва! Каму, як не Вам, нашаму старэйшаму драматургу, павесці за сабой сваіх сабратоў па пяру і асабістым прыкладам давесці, што пяро сатырыка і байкапісца па-ранейшаму вострае.

В. Вольскі, І. Гурскі, В. Вітка, А. Макаёнак, А. Кучар, К. Губарэвіч, А. Маўзон, Я. Рамановіч, В. Палескі! Мы не збіраемся папракаць вас у неактыўнасці, але лічым сваім абавязкам напомніць, што тэатры чакаюць новых п'ес. Колькі тэм падказвае штодзённа жыццё, і кожная з гэтых тэм важная для выхавання совецкіх людзей. Нам патрэбны п'есы добрыя і розныя па тэме, жанрах, і вы здольныя іх стварыць, каб даць тэатрам належны матэрыял для сцэнічнага ўвасаблення. Асабліва мы маем патрэбу ў драмах і камедыях, якія адлюстроўваюць жыццё калгаснай вёскі ў адпаведнасці з апошнімі пастановамі партыі. Нам патрэбны гераічныя п'есы аб мінулым нашай Радзімы, патрыятычныя творы аб цудоўнай сучаснасці, патрэбны героі, здольныя быць прыкладам для маладога пакалення.

Таварышы празаікі і паэты—І. Шамякін, П. Пестрак, М. Паслядовіч, П. Броўка, М. Танк, А. Куляшоў, К. Кірэенка, А. Вялюгін! Мы заклікаем вас уключыцца ў вялікую нашу агульную справу — справу напісання новых беларускіх п'ес. Лепшыя вашы аповесці і паэмы чакаюць інсцэніроўкі, дзякуючы чаму яшчэ больш пашырыцца кола іх дзеяння, і нашы гледачы ўбачаць сваіх любімых герояў не толькі з кніжных старонак, а ўвасобленымі ў жывыя сцэнічныя вобразы.

Маладыя пісьменнікі! Смела спрабуйце свае сілы ў цяжкім, але ўдзячным жанры драматургіі, і мы вам з гатоўнасцю і любоўю заўсёды дапаможам сваім вопытам і веданнем сцэны.

Для калектыву тэатра імя Якуба Коласа беларуская совецкая драматургія заўсёды была сваёй роднай, кроўнай справай.

Мы пачынаем падрыхтоўку спектакля «У пушчах Палесся» Якуба Коласа. Старэйшы беларускі пісьменнік актыўна ўключыўся ў гэтую работу. Апрача таго, тэатр працуе над п'есай Пятра Глебкі і з маладымі драматургамі над іх першымі п'есамі. Але ўсё гэта вельмі мала яшчэ.

Таварышы пісьменнікі! Чакаем добрых совецкіх п'ес, на аснове якіх мы абяцаем, стварыць спектаклі, вартыя нашага вялікага народа.

А. ІЛЬІНСКІ, І. ДОРСКІ, А. СКІБНЕЎСКІ, Н. ЛОЙТАР, М. ЗВЕЗДАЧОТАЎ, Ц. СЯРГЕЙЧЫК, А. ТРУС, М. БЯЛІНСКАЯ, Е. РАДЗЯЛОЎСКАЯ, А. ШЭЛЕГ, З. КАНАПЕЛЬКА, С. СКАЛЬСКІ, Н. ГЛЕБАЎСКАЯ, Ф. ШМАКАЎ.

Сяброўскія сустрэчы

За апошні час у сталіцы Літоўскай ССР і іншых гарадах рэспублікі выступалі майстры мастацтва БССР. У канцэртах удзельнічалі артысты Млодэк, Ворвулеў, Ніжнікава, Дзянісаў, Жыновіч, Астрамецкі, Эфрон і іншыя.

Нядаўна ў спектаклях Літоўскага тэатра оперы і балету «Пікавая дама», «Царская нявеста», «Еўгеній Онегін», «Рыгалето» і «Лебядзінае возера» спявалі Ворвулеў, Млодак, Ніжнікава і танцавалі Ражанава, Глінскіх, Розенблат. Гледачы сардэчна віталі нашых салістаў.

У Беларускім тэатры оперы і балету ў партыі Мефістофеля (опера «Фауст») з поспехам выступіў заслужаны артыст Літоўскай ССР, лаўрэат Сталінскай прэміі Р. Сіпарыс. У гэтай ролі Сіпарыс паказаў сябе з найлепшага боку. Прыгожы голас, высакароднасць артыстычнай манеры, выдатнае веданне партый і бездакорная інтанацыя — усё гэта гарманічна спалучалася ў яркім вобразе Мефістофеля.

У оперы «Рыгалето» партыю Рыгалето выконваў заслужаны артыст Літоўскай ССР К. Шылгаліс. Артыст заваяваў сімпатыю гледачоў сваімі добрымі вакальнымі дадзенымі. Сцэнічны тэмперамент, глыбокае пачуццё ансамбля і яркая музычнасць падкрэсліваюць высокае прафесіянальнае майстэрства спевака.

Такія абменныя гастролі прыносяць узаемную карысць і творча ўзбагачаюць мастацтва брацкіх народаў.

І. БАЛОЦІН,
народны артыст БССР.

Праца ў імя міру

ГУЛЯЮЦЬ над палямі вясновыя вятры. Снег ужо сышоў, і толькі мясцінамі ў нізінах цьмяна бялеюць яго лапіны. На дарозе пад нагамі пахрустваюць ільдзінкі.

Жывёлагадоўчая ферма першай брыгады. Адзін прыгажэй другога выстраіліся тры новыя кароўнікі. Штохвіліны з дзвярэй дзяўчаты выносяць бліскучыя бідоны з малаком. Жанчына сярэдняга росту ў беласнежным фартуху з вёдрамі ў руках спынілася каля чорнай, з белымі плямамі, каровы. Буронка паглядзела на яе разумнымі вачыма, даверліва пацягнулася і шурпатым языком лізнула працягнутую руку. У Анастасіі Апонік, лепшай даяркі калгаса імя Панамарэнкі Гродзенскага раёна, заўсёды ёсць для яе ў запасе кавалачак цукру. Непрыглядная на выгляд кароўка дае ў дзень па пятнаццаць і больш літраў малака. А Анастасія Апонік у мінулым годзе надаіла ад кожнай каровы па 2.100 літраў. Цяпер-жа яна ўзяла абавязацельства атрымаць па тры тысячы літраў. Падкінуўшы ў кармушку ахапак свежага сена, даярка абмыла цёплай вадой вымя, выцерла яго сухім рушнікам, прамасіравала. З-пад яе лоўкіх рук, абганяючы адзін аднаго, пабеглі струменьчыкі малака.

Дабіцца высокіх удояў нялёгка, але цяжкасці не палохаюць Анастасію Апонік. Яна яшчэ добра памятае няўтульны хлеў, у якім стаялі каровы тры гады назад. Нехапала саломы і сена. Цяпер круглы год яна дае сваім каровам свежы сакавіты корм. Нядаўна ўстанавілі аўтапаілкі. Праўда, яны яшчэ не дзейнічаюць. Аднак праўленне калгаса цвёрда вырашыла ў гэтым годзе поўнасцю механізаваць усе працаёмкія работы на жывёлагадоўчых фермах. Як-жа іначай. Сорамна — калгас мільянер. Па надою малака выйшаў на другое месца ў рэспубліцы. Механізацыя намнога палегчыць працу даярак. Тады, думала Анастасія, можна будзе не толькі выконваць, але і перавыконваць узятыя абавязацельствы.

А струменьчыкі малака беглі і беглі, пакідаючы на бляшаных сценках узорчатыя матавыя палоскі.

Тым часам цялятніца Вера Лупачык карміла сваіх гадаванцаў. Ужо не маладая, але поўная энергіі, яна за год вырасціла 70 цялят. У мінулым годзе Вера Лупачык была ўдзельнікам сельскагаспадарчай выстаўкі. Цяпер зноў збіраецца ў Маскву. З гордасцю паказвае яна сваю ўзнагароду — Грамату Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР.

— Не я адна — таварышы дапамагалі, вучылі, — не спыняючы сваёй работы, расказвае Вера. — Цяжка было спачатку, цяляты былі худыя, валіліся з ног ад недаядання. Многа дапамог мне муж Кузьма Нікалаевіч. Ён у мяне вопытны жывёлавод. І малако кіпяціў, і ваду падгараваў для цялят, паказваў, як карміць іх з соскі. Помню аднойчы, далі мне цяля, а яно нічога есці не бярэ. Няньчылася я з ім, няньчылася, глядзіць на мяне вялікімі вачыма, як быццам хоча нешта сказаць. Паплакала я тады. Шкода, усё роўна, як дзіцё малое. Вось і параіў мне тады Кузьма цукру ў малако падсыпаць. Падсыпала. П'е цяля падсалоджанае малако, а я радуюся. Цяпер такі бычок — глянуць люба. І колькі мы з Кузьмой іх вырасцілі, не злічыш. Вось праўнук таго бычка, тыдня яму яшчэ няма, а які дужанькі. — Вера Фамінічна зайшла ў загарадку, дзе чорнае цяля, скачучы, даўно імкнулася звярнуць на сябе яе ўвагу.

— Ну, што дурненькі, — пяшчотна сказала жанчына, — есці хочаш? Зараз прынясу.

Цяля ўткнулася пысай у яе падол, пазнала сваю гаспадыню.

Непадалёку ад жывёлагадоўчай фермы знаходзіцца калгасная цяпліца.

Доўгая цагляная будоўля. Шкляны дах пераліваецца безліччу праменняў.

Калі на двары гуляе ўсімі фарбамі вясна, дык тут сапраўднае лета. Радуюць вока зялёныя пер'і цыбулі, лісткі салату, чырвоныя галоўкі радысу, ружовыя хвосцікі морквы. Вясёлыя дзяўчаты ў летніх сукенках паліваюць градкі, на якіх расце капуста, агуркі, памідоры. Са скрынак цягнуцца да сонца зялёныя парасткі кукурузы.

Дзверы адчыніліся, увайшоў невысокі мужчына, апрануты ў цёмнае паліто з каракулевым каўняром. Гэта старшыня арцелі Грыгорый Паўлавіч Кавальчук.

— Горача, як у Крыме, — прагаварыў ён. — Якая тэмпература?

— 28 градусаў, — адказала поўная светлавалосая дзяўчына.

— Ого! Ці гэта не зашкодзіць кукурузе?! У нас на Беларусі такая тэмпература не часта бывае, — казаў старшыня, пагладжваючы яшчэ кволыя парасткі расліны.

— Не зашкодзіць. Мы-ж на ўсходжасць правяраем...

— Так. У гэтым годзе 150 гектараў засеем. У асноўным на тарфяніках. Сама разумееш, якое значэнне маюць папярэднія вынікі.

— Вынікі ўжо відаць, — адазвалася загадчыца цяпліцы. — Бачыце, як вырасла за паўтара месяца. Хутка ўраджай можна будзе здымаць, — пажартавала яна.

— А гародніну калі ўбіраць будзем? Мне сёння званілі з горада, прасілі прыслаць...

— Ужо можна, — адказала Валя Вачынская, брыгадзір агароднай брыгады, і для пробы вырвала некалькі галовак радысу.

Не першы ўраджай за гэтую зіму знялі яны ў калгаснай цяпліцы. Агародная брыгада ўжо адправіла для працоўных горада дзесяткі кілограмаў ранняй гародніны.

Доўга хадзіў старшыня па цяпліцы. Сам аграном, ён даваў добрыя парады агароднікам. А адыходзячы, папярэдзіў:

— Не забыліся, сёння-ж сход, прыходзьце ўсе. Апошняя нарада перад наступленнем...

Многалюдным быў гэты сход, і кожны калгаснік, выступаючы, гаварыў аб адным, каб своечасова правесці сяўбу, каб сабраць багаты ўраджай.

... Прыціх пасёлак, не гараць агеньчыкі ў вокнах, не дымяцца коміны. Адпачываюць, спяць людзі. Некалькі разоў прайшоў пад вокнамі вартаўнік, пастукваючы ляскоткай. У кабінеце старшыні ўсё яшчэ свет. Грыгорый Паўлавіч дапісвае, што яшчэ засталося зрабіць. У яго запісную кніжку роўнымі радкамі кладуцца словы прапановы: «Заўтра трэба з'ездзіць па хлорыстый калій. Не забыць папярэдзіць конюхаў, каб рабочым коням вышісвалі больш аўса. Яшчэ трэба даведацца ў МТС, чаму не поўнасцю прыслалі машыны...». Старшыня падышоў да акна, адчыніў фортачку. У твар ударыў свежы марозны вецер. На небе гарэлі перадранішнія зоры. Набліжалася світанне. Новы дзень мірнай стваральнай працы падрыхтаваўся ўступіць у свае правы.

Э. ЧАЧКО.

Калгас імя П. К. Панамарэнкі,
Гродзенскі раён.

Да вынікаў Рэспубліканскага агляду сельскай мастацкай самадзейнасці

СВЯТА НАРОДНЫХ ТАЛЕНТАЎ

«За шчасце народа» — літаратурна-музычны мантаж мастацкага калектыву Клецкага раённага Дома культуры.

Праз казачнае акно

Заключны канцэрт Рэспубліканскага агляду сельскай мастацкай самадзейнасці даў нам магчымасць яшчэ раз заглянуць у невычарпальную скарбніцу народнага мастацтва.

Іменна такое адчуванне, што ты сядзіш каля нейкага казачнага акна, і перад табою, згодна ўсемагутным казачным законам, праходзіць прыгажосць то аднаго, то другога кутка тваёй Радзімы.

Вось гучыць непаўторна прыгожа песня аб тым, як усхвалявалася сіне мора, у якім купаюцца лебедзь з арлом; яе змяняе бойкая дзявочая частушка пра гора-агранома, які сядзіць дзень за днём у канторы ды лічыць варон на плоце; тады плыве са сцэны ціхая, лагодная, як летні вечар, песня пра наша калгаснае жыта, што кланяецца цяжкім коласам рупліваму гаспадару; шчыры смех выклікае старадаўняя жартоўная песня пра няўдалыя прыгоды камара, закаханага ў муху; буйная радасць гучыць у «Карагоднай», у «Вечарынцы у калгасе», у вясёлым расказе пра тое, як «Ох, і сеяла Ульяначка лянок», і ў «Бульбе» на новы лад, на новыя, удалыя словы паэта С. Дзяргая.

Так ідуць яны — песня за песняй — гавораць табе пра Слонім і Азершчыну, Багушэўск і Нясвіж, пра радасць, якая дружыць з нашым хлебаробам...

Песні перамяжаюцца з танцамі. Слуцкі Юрачка з вяргіняй у кішэнцы кашулі, з пшанічным чубам і раскошным поясам; ашмянскае «Кола» і нясвіжская «Кадрыля» — прыгожая ў сваёй заўсёды свежай, народнай непасрэднасці; «Бульба» і «Беларуская полька», у якіх на ўсю сілу сваёй весялосці вірыць быстраногая моладзь з ваколіц Смаргоні і Рэчыцы...

Ні песня, ні танец — ніякая радасць не адбываюцца ў нас без цымбалаў, гармоніка, скрыпкі... Таму, відаць, з такім пачуццём уласнай годнасці выступалі разам з моладдзю сівавусыя скрыпачы і цымбалісты з Шарашова і Асіповіч, таму так многа гавораць частушкі пра гарманіста, таму так шчыра апладыруюць слухачы дзесяцігадоваму цымбалісту з Івацэвіч і яшчэ меншаму балалаечніку з Сіроціна.

Прыемнае ўражанне пакідае і тая ўвага, якой карыстаецца ў народзе мастацкае слова. Чуючы вядомы верш Панчанкі ва ўдалым выкананні вясёлай, бойкай шклоўскай дзяўчыны, вядомую байку Корбана, якую чытае работнік Брагінскай МТС, — успрыймаеш гэтыя творы неяк па-новаму, нібы яны пасвяжэлі ад дружбы з чытачом.

Не менш прыемным сведчаннем гэтай дружбы з'яўляюцца і новыя песні на словы нашых паэтаў, песні, якія палюбіў народ. Аб гэтым, да рэчы кажучы, аб удзельнай вазе пісьменніцкага слова ў вялікай справе супрацоўніцтва з народам-стваральнікам павінны былі-б трохі больш памятаць арганізатары прагляду, якія не здагадаліся запрасіць у склад журы ніводнага пісьменніка.

Асобнае слова належыць дружбе народаў — цудоўнаму, жыццедзейнаму пачуццю, якім прасякнута ўся мастацкая творчасць нашай калгаснай вёскі, як насычана ім і ўсё наша жыццё.

Гераічная руская песня «Вараг», якую выконвае калгасная харавая капела, «Сцяліся, барвінку» — чароўная песня з пшанічных палёў залатой Украіны, рускі лірычны карагод «Лябёдушка» ў грацыёзным выкананні гарадзішчанскіх дзяўчат, харавыя і сольныя песні, музыка, танцы, мастацкае слова рускага, украінскага, польскага, чэшскага народаў — усё гэта глядзіцца і гучыць як наша, непадзельна сваё, навекі роднае.

Другое слова — гэта падзяка тым скромным і часамі непрыкметным працаўнікам на ніве роднага мастацтва — настаўнікам, рахункаводам, механізатарам, урачам, ільнаводам, — шчырая і натхнёная праца якіх стварае і хлеб, і песню. Іх многа ў нас, гэтых людзей, адны з іх вядомыя больш, другія — менш, з трэцімі мы яшчэ будзем знаёміцца. І я ганаруся магчымасцю перадаць ім усім са старонак

Удзельніца мастацкай самадзейнасці Шклоўскага раённага Дома культуры Магілёўскай вобласці **Г. Нікалаева** выконвае рускую сучасную песню «На калгасны з'езд я ад'язджала».

нашай пісьменніцкай газеты шчырае прывітанне.

Да новых поспехаў, дарагія сябры, да новай сустрэчы, — і ў Мінску, і там, куды вы цяпер вярнуліся з Мінска, каб новай працай упрыгожваць нашу новую мірную вясну!

Янка БРЫЛЬ.

Вясковыя музыканты

На аглядзе шырока было прадстаўлена музычна-інструментальнае мастацтва. Каларытна прагучэў аркестр цымбалістаў пад кіраўніцтвам Н. Барадаўкі (Асіповіцкі раён) у якім, акрамя цымбал, былі скрыпкі і баяны. Вялікай цеплынёй вызначалася выкананне гэтым аркестрам беларускіх і украінскіх мелодый.

Зладжана і стройна выканаў рускія народныя напевы балалаечны аркестр Брожскага сельскага клуба Бабруйскага раёна (кіраўнікі А. Мышак і Б. Варфаламееў). Іх выступленне магло быць больш яркім, калі-б басовая група аказалася мацнейшай і больш смела было праведзена раздзяленне балалаек на самастойныя партыі. Больш цікавай павінна быць інструментоўка і значна шырэй трэба было карыстацца прыёмамі ігры на балалайках.

Добрую музычнасць, даволі высокую тэхніку і лёгкасць выканання можна адзначыць у домравым аркестры Драгічынскага Дома культуры пад кіраўніцтвам М. Тыцюка. Яго праграма была выканана на значным музычным узроўні, але без належнай чыстаты ладу. Удачай у выступленні сям'і Касіловіч з Дзержынскага раёна з'яўляецца падзел цымбал на прымы і альты, што ўзбагаціла і пашырыла рэгістры, дало магчымасць больш цікава выканаць праграму. Узрасло майстэрства дуэта цымбалістаў Бянько (бацька і сын) з Брэсцкай вобласці. Выкананне малодшага Бянька стала больш упэўненым, з лепшай тэхнікай і музычнасцю.

Тонкае адчуванне рытму ў музыцы паказаў пяцігадовы хлопчык Мураўёў з Бараўлянскага сельсавета Віцебскага раёна.

Аграном соўгаса «Дзесяцігоддзе Кастрычніка» Рэчыцкага раёна А. Хахлоўскі даўно ўжо іграе на цымбалах, удасканальвае сваё выканаўчае майстэрства. Тэхніка яго ігры знаходзіцца на добрым узроўні, але ён не пашырае свой рэпертуар.

З добрым густам выканалі сельскія настаўнікі Стаўбцоўскага раёна А. Дабрэнка і Е. Міцюрын «Персідскі марш» Штрауса на балалайцы і гітары. Вельмі шкада, што такая вобласць, як Маладзечанская, дзе ледзь не ў кожнай вёсцы іграюць на цымбалах, амаль зусім занядбала гэты цікавы жанр. Энтузіяст-арганізатар цымбальных калектываў А. Дзяруга чамусьці не прыцягнуты да гэтай справы.

Нягледзячы на вялікую колькасць выканаўцаў на розных народных інструментах, усё-ж народны музычна-інструментальны жанр у рэспубліцы развіваецца слаба.

Народныя музыканты ў пераважнай сваёй большасці іграюць на старых, архаічных цымбалах, выканаўчыя магчымасці якіх абмежаваны.

У нас мала што робіцца для шырокага авалодання нотнай граматай удзельнікамі мастацкай самадзейнасці. Для гэтага патрэбны кадры. Але калі меркаваць па штогодніх выпусках спецыялістаў па народных інструментах у нашых музычных вучылішчах, дык сапраўдныя патрэбы ў кіраўніках на вёсцы і ў прамысловых цэнтрах будуць задаволены толькі праз многа дзесяткаў год.

Да гэтага часу ў рэспубліцы не вырашана пытанне аб вучобе дзяцей, якія маюць музычныя здольнасці. Мінская школа-дзесяцігодка навучае толькі сталічных дзяцей. Даўно наспела пытанне арганізацыі школы для таленавітага юнацтва з усёй рэспублікі.

Выхаванцаў музычных навучальных устаноў неабходна смялей накіроўваць у вёску, дзе яны будуць сапраўднымі арганізатарамі і прапагандыстамі музычнай культуры.

Трэба лепш папулярызаваць дасягненні прафесіянальнага мастацтва, друкаваць хоць-бы невялікія брашуры пра калектыўнае і індывідуальнае выкананне на беларускіх народных інструментах, рыхтаваць і распаўсюджваць неабходны рэпертуар.

І. ЖЫНОВІЧ,
народны артыст БССР.

Шукаць новае

Апрача вядомых беларускіх танцаў «Лявоніха», «Крыжачок», «Юрачка», «Бульба», на аглядзе былі прадстаўлены і новыя: «Кола», «Козачка», «Кросны», «Кадрыля». Беларускіх народных танцаў існуе каля сямідзесяці, а мы вось ужо каторы год вельмі мала бачым іх. Прывозяць калектывы ўсё больш такія танцы, як «Крыжачок» ды «Лявоніху». Вядома, гэта добрыя танцы і аб іх нельга забываць, аднак, неабходна шукаць і новыя.

Наша совецкае мастацтва ўзбагачаецца са скарбніц народнай творчасці. Яна-ж падарыла нам у свой час цудоўную «Польку - вязанку», «Лядкаўскую кадрыль», «Чарот».

Дом народнай творчасці павінен творча кіраваць самадзейнымі калектывамі. У яго штаце патрэбны высокакваліфікаваныя кансультанты. Я помню выдатны народны калектыў Т. Лапацінай, які прыехаў да нас і прывёз цудоўныя песні і танцы. На наступны агляд гэты калектыў прыехаў непазнавальным. Ён страціў сваю народнасць, у яго з'явілася многа наноснага, чужога, тэатральнага. І гэта было пасля аказання «дапамогі». Так стараліся кансультанты дапамагчы таленавітаму калектыву. Гэта было ў 1947 годзе.

У аглядах цяпер адсутнічаюць чачоткі, акрабатычныя эцюды, жартоўныя матроскія танцы, якіх так многа было раней. У асноўным пераважаюць народныя танцы. Але і ў іх заўважаецца няправільны кірунак. Вельмі любяць рабіць сюіты. Гэта, вядома, запазычана з тэатральных калектываў. Тыя сюіты, што бачыла я,— беларуская і украінская — гэта мешаніна з беларускіх танцаў. Людзі засаб танцуюць адзін за другім тры танцы — «Польку-Янку», «Крыжачок» і «Лявоніху». Усе яны атрымоўваюцца дрэнна, губляецца выразнасць, жыццерадаснасць, уласцівыя кожнаму з іх. Выканаўцы танцуюць, абы толькі станцаваць (калектыў Віцебскага Дома культуры — кіраўнік О. Партной). Гэты-ж калектыў паказаў другі танец, які таксама складаецца з трох рускіх танцаў. Яны не адрозніваюцца адзін ад другога, змяняецца толькі музыка, або «Ах вы, сени мои», або «Ох полна, полна коробушка». Тут сабраны рухі з беларускіх, украінскіх і рускіх танцаў. Навошта такая мешаніна? Кожны з іх мае пэўны рысунак, уласцівы іменна толькі яму. Навошта-ж мяшаць усё ў кучу? Вялікі і добры калектыў, але мастацкі кірунак няправільны.

У многіх калектывах ёсць падобныя недахопы.

«Кадрыля» паказана калектывам Ланьскага сельскага клуба Нясвіжскага раёна (кіраўнік І. Шуста). Гэта — беларускі танец у чыстай народнай форме. Ён цудоўна выкананы ўдзельнікамі гуртка, арыгінальны па свайму рысунку і развіццю.

Танец «Кола», які выконвае калектыў калгаса «Комінтэрн» Аршанскага раёна (кіраўнік Е. Шалуха, кансультант Н. Тышэвіч), — цікавы. Яго мы бачым упершыню. Ён пабудаваны па ўзору беларускага арнамента.

«Козачку» мы таксама бачылі ўпершыню. Яе арыгінальна выконваў калектыў Ізабелінскага сельскага Дома культуры. Аднак, мне здаецца, ён малацікавы: прымітыўна імітуе рухі жывёл.

У заключэнне была паказана тэатралізаваная «Лявоніха», пастаўленая К. Мулерам па музыцы Аладава, рытмічна вельмі цяжкой. Зводныя калектывы выдатна справіліся з гэтым заданнем і за кароткі час вывучылі і перадалі імклівы тэмперамент і музычнасць танца.

Асноўную ўвагу трэба звярнуць на пастаноўку народных танцаў. Гэта з'яўляецца высакароднай задачай Дома народнай творчасці.

А. НІКАЛАЕВА,
народная артыстка БССР.

Павышаць культуру спявання

Многа прыемных і цікавых уражанняў пакінуў у кожнага з прысутных апошні тур Рэспубліканскага агляду сельскай мастацкай самадзейнасці. Шматлікія інструментальныя і вакальныя ансамблі, хоры, аркестры, танцоры, спевакі паказалі прыкметны зрух, якога дабілася народнае выканаўчае мастацтва беларускай вёскі за апошнія гады.

Калі раней у калгасных хорах або танцавальных гуртках прымала ўдзел 16 — 20 чалавек ці 3 — 4 пары, дык цяпер ёсць калектывы, дзе спяваюць да 70 чалавек і танцуюць да 14 пар, як, напрыклад, хор калгаса «1-е Мая» Нясвіжскага раёна пад кіраўніцтвам П. Касача і танцавальны калектыў з Вілейскага раёна пад кіраўніцтвам П. Грыбоўскай.

Як і заўсёды, найбольш масава былі прадстаўлены на аглядзе харавыя калектывы, вакальныя ансамблі і асобныя спевакі-салісты. Сярод лепшых—хоры: калгаса імя Леніна Ляхавіцкага раёна (кіраўнік Г. Праневіч), калгаса імя Леніна Калінкавіцкага раёна (кіраўнік Б. Катцан), Будслаўскага сельскага Дома культуры (кіраўнік П. Мядзёлка), сяла Азершчына (кіраўнік Т. Лапаціна), Прысынкаўскага сельскага клуба (кіраўнік П. Шыдлоўскі).

Што характэрна для гэтых хораў?

Ляхавіцкі калектыў вызначаецца выдатнай нюансіроўкай, дакладнасцю ладу. У праграме, складзенай з беларускіх народных песень, сучасных і традыцыйных, хор паказаў добрае пачуццё вобразнасці твораў.

Высокая культура характэрна для Будслаўскага хору, які выконвае а-капела вялікую праграму на беларускай, рускай, украінскай і польскай мовах, спявае натхнёна такія складаныя творы, як, напрыклад, «Хор швейцарцаў» з оперы «Вільгельм Тэль» Расіні.

Выдатнымі якасцямі Азершчынскага і Прысынкаўскага хораў, акрамя іх агульнай музычнасці, з'яўляюцца тыя паспяховыя намаганні, якія тут праводзяцца па складанню ўласных тэкстаў і мелодый да іх на матэрыяле калгаснага жыцця. Уласныя песні выконваюцца з выключнай прывабнасцю.

Заслугоўваюць увагі харавая капела калгаса імя Варашылава Гомельскага раёна (кіраўнік В. Валатоўскі); вялікі і моцны хор пад кіраўніцтвам П. Касача з шырокай і рознастайнай праграмай з твораў беларускіх совецкіх кампазітараў, у тым ліку і добрых песень самога кіраўніка (напрыклад «Цімох» на тэкст А. Русака); тэмпераментныя Багушэўскі хор пад кіраўніцтвам А. Сінельнікава і Пастаўскі — кіраўнік В. Шмякаў. Але гэтыя калектывы, як і тыя, аб якіх тут не гаварылася, маюць шэраг хібаў, што перашкаджаюць іх мастацкаму росту.

На што трэба звярнуць увагу нашым харавым калектывам?

Многія фальшыва інтаніруюць таму, што кіраўнікі не дабіваюцца такога стану, калі кожны спявак бездакорна ведае сваю партыю: і мелодыю, і тэкст. Не звяртаецца ўвагі і на тое, каб рэжым дыхання быў у кожнай групе аднолькавы. Адсутнасць гэтай умовы таксама прыводзіць да фальшу і да драбнення мелодыі. Нездавальняючая і выразнасць дыкцыі: спевакі не вымаўляюць ясна словы, праглынаюць пачаткі і канцы фраз, — што таксама ў многім залежыць ад правільнага дыхання выканаўцаў. Наглядаюцца выпадкі, калі пры спяванні пад акампанемент музыканты мяняюць танальнасць твора: харыстам даводзіцца спяваць не ў іх рэгістравых і дыяпазонных магчымасцях. Гэта прыводзіць да таго, што спевакі, як кажуць, або «давяцца», або крычаць: танальнасць занадта нізкая ці занадта высокая. Неабходна кіраўнікам прарабіць значную работу ў выраўненні сілы гучання кожнай з мужчынскіх і жаночых партый, бо вельмі часта адны харавыя партыі ў калектывах «перакрываюць» па гучанню другія, а гэта адмоўна адбіваецца на якасці нюансіроўкі, знішчае прыгажосць голасавядзення.

Значнай хібай у развіцці вакальна-харавой культуры сельскай мастацкай самадзейнасці з'яўляецца аднабаковасць рэпертуару і інертнасць у авалоданні жанрам а-капельнага спявання. На працягу агляду заўважаліся выпадкі, калі хоры з акампанементам па прапанове журы выконвалі тыя-ж творы без суправаджэння, прычым нават лепш. Гэта пацвярджае думку, што некаторыя кіраўнікі або недаацэньвалі вялікія магчымасці сваіх гурткоўцаў, або не разумелі, што а-капельнае спяванне з'яўляецца вышэйшай формай харавога мастацтва, глыбока народным жанрам, і дае выключныя магчымасці для развіцця агульнай музычнасці і мастацкай культуры харыстаў.

Што датычыць рэпертуару, дык тут на наш погляд два карэнныя недахопы. Першы — гэта тое, што руская і зарубежная класіка, лепшыя творы совецкіх кампазітараў, займаюць нязначнае месца ў рэпертуары сельскіх калектываў. А значыць, творы, дзе ўлічаны ўсе магчымасці харавога спявання, не становяцца здабыткам самадзейнасці, не дапамагаюць яе росту. Другі недахоп у тым, што калектывы абмяжоўваюць свае выканаўчыя магчымасці спяваннем толькі лірычных народных і масавых песень, зрэдку выконваюць жартоўныя.

А дзе-ж цудоўныя народныя эпічныя і гераічныя, дзе бадзёрыя аптымістычныя сюжэтныя песні аб нашым сучасным жыцці? Аб іх чамусьці забылі многія калектывы, а гэта вельмі звужае іх дыяпазон, робіць манеру спявання наўмысна прыглушанай, аднастайнай.

У трэцім туры Рэспубліканскага агляду прыняло ўдзел, акрамя хораў, звыш пяцідзесяці вакальных ансамбляў: дуэтаў, трыё, квартэтаў вакальных груп і асобных спевакоў-салістаў. Прыемна ўспомніць вакальны дуэт у складзе Т. Масейка і Л. Шмякавай, салістку З. Філімончык з Маладзечанскай вобласці, салістак А. Капусціну (Віцебшчына), Л. Хваінскую (Магілёўшчына), А. Семеннікаву, дуэты Н. Нікановіча і Н. Назарава (Брэсцкая вобласць), М. і Н. Серак, квартэт — А. Надтачаеву, С. Шкурынаву, Е. Калачову, У. Калачову (Гомельшчына), Т. Фарленка, С. Усачову (Мінская вобласць). У іх прыгожыя галасы, адчуванне стылю твора, уменне спяваць у ансамблі.

Добры вакальны матэрыял у Б. Дробата, М. Гануша, П. Шульгі, Н. Нікановіча,

Калгасніцы **А. Надтачаева, С. Шкурынава, Е. Калачова, У. Калачова** выконваюць беларускую народную песню «У нашым сяле свадзьба будзе».

В. Сталяровай, А. Сафроненка, М. Ліштван, С. Сахаравай і іншых прадстаўнікоў розных раёнаў рэспублікі. Але гэтым таварышам трэба звярнуць асаблівую ўвагу на рытмічны бок выканання, дакладнасць мелодыі, правільную пабудову фразы.

М. ПІГУЛЕЎСКІ,
адказны сакратар праўлення Саюза совецкіх кампазітараў БССР.

Самадзейныя спектаклі

Рэспубліканскі агляд сельскай самадзейнасці пераканальна паказаў, што многія драматычныя гурткі смела бяруцца за вырашэнне складаных творчых задач і дабіваюцца значных поспехаў. Гэта можна сказаць пра калектывы Слонімскага і Пастаўскага раённых Дамоў культуры.

Прычына поспеху пастаноўкі сатырычнай камедыі А. Макаёнка «Выбачайце, калі ласка!» у драматычным калектыве Пастаўскага раённага Дома культуры ў тым, што рэжысёр В. Галкін, які ўважліва «прачытаў» п'есу і добра ў ёй разабраўся, павёў калектыў па лініі жыццёвай дакладнасці, па рэалістычнаму шляху. Таму амаль усе вобразы пазбаўлены найгрышу.

Возьмем, напрыклад, В. Шмякава — выканаўцу ролі Каліберава. Ад пачатку і да канца верыш паводзінам гэтага чалавека. Вось ён з'яўляецца на сцэне і пачынае нервова шукаць запалкі, каб закурыць. Глядач выразна адчувае, што не толькі схаваныя жонкай запалкі непакояць Каліберава, але і яшчэ нешта іншае, больш важнае. І сапраўды, пазней мы даведваемся, што ён атрымаў партыйную вымову.

М. Ароцкая, якая выконвае ролю жонкі Каліберава Антаніны Цімафееўны, вельмі дакладна разумеючы сутнасць сваёй гераіні, стварае сатырычны вобраз мяшчанкі, якая толькі і марыць аб тым, каб вярнуць былую пасаду мужу, а сабе — паразітычнае жыццё ў сталіцы. Моцкіна вельмі дакладна і ярка іграе В. Галкін. Моцкін у В. Галкіна — гэта надзвычай дзелавы чалавек, які заклапочаны найлепшым выкананнем сваіх абавязкаў. Толькі паступова раскрываецца, якімі сродкамі ён дамагаецца аўтарытэту ў начальства. Роля набывае сатырычную глыбіню і праўдзівасць.

Гэтай групе адмоўных вобразаў, да якіх трэба далучыць і дырэктара спіртзавода Печкурова (ролю яго выконвае С. Меляшкевіч), супрацьстаіць маса калгаснікаў на чале з вясковай актывісткай Ганнай Чыхнюк (М. Вароніна). Сярод сумленных і простых совецкіх людзей, патрыётаў сваёй справы — калгасніца Марыя Кірылаўна (Е. Жукоўская), брыгадзір Міхальчук (І. Мартушэнка), настаўніца Наташа Гарошка (З. Івінская), карэспандэнт Гардзіюк (Е. Галаўко) і піонер Лёня, ролю якога вельмі ўпэўнена выконвае вучань Р. Блашкевіч.

Асобна хочацца сказаць пра выканаўцу ролі старшыні калгаса Гарошкі — М. Мацкевіча. У ім прываблівае непасрэднасць і сапраўдны тэмперамент, але гуртковец пераігрывае, занадта націскае на камедыйнасць. Таму часам, асабліва ў другой дзеі, губляюцца рысы натуральнасці і вобраз ператвараецца ў шарж. Мацкевічу трэба быць бліжэй да ўсяго ансамбля выканаўцаў.

«Выбачайце, калі ласка!» паказаў і другі ўдзельнік агляду — драматычны калектыў Багушэўскага раённага Дома культуры. Рэжысёр Р. Сарочкіна правільна накіроўвае выканаўцаў па шляху праўдзівага адлюстравання жыцця. Яны адчуваюць сябе проста і натуральна на сцэне, але ў большасці выпадкаў не дасягаюць стварэння мастацкіх вобразаў. Пастаноўка знаходзіцца нібы на першым этапе свайго развіцця. Над ёй неабходна яшчэ добра папрацаваць, каб паглыбіць вобразы, дабіцца іх мастацкага абагульнення, зрабіць больш дзейсным развіццё падзей у п'есе, больш яркай яе сатырычную лінію.

Заслужаным поспехам у гледачоў карыстаецца спектакль драматычнага калектыву Слонімскага раённага Дома культуры «Капітан у адстаўцы» А. Сімукова. Жыццерадасная і вясёлая камедыя-вадэвіль знайшла ў Слонімскім калектыве добрых выканаўцаў. Яны іграюць яе лёгка і з захапленнем, нідзе не трапляючы ні ў шарж, ні ў карыкатуру.

Выкарыстоўваючы любімы і незаслужана забыты жанр вадэвіля, аўтар «Капітана ў адстаўцы» напоўніў яго сучасным зместам і даў магчымасць калектыву стварыць жыццёва праўдзівы, камедыйна яркі спектакль.

Рэжысёр М. Фрыдман, магчыма, занадта асцярожна паставіўся да спецыфічнага жанра, баючыся навізны совецкага вадэвіля, і таму часам спектакль збіваецца на бытавую камедыю.

Найбольшую ўвагу ў спектаклі прыцягвае яго цэнтральная фігура — капітан у адстаўцы Сергей Іванавіч Ускоў. У выкананні гэтай ролі А. Бяловым галоўны герой набыў рысы прывабнага маладога чалавека, поўнага высакародных намераў і патрыятычных пачуццяў. Капітан марыць спаткацца з дзяўчынай, якая некалі прыслала яму на фронт захапляючы верш аб вернасці і дружбе, аднак сама засталася невядомай, не назваўшы сябе ў пісьме. Розным прыгодам капітана, які накіроўваецца на Далёкі Усход, а па дарозе знаходзіць сваё шчасце, і прысвечаны гэты вадэвіль.

«Лявоніха» — беларускі народны танец. Выконваюць удзельнікі заключнага канцэрта агляду сельскай мастацкай самадзейнасці БССР.

Фото **І. Салавейчыка.**

У А. Бялова надзвычай добрыя акцёрскія якасці для гэтай ролі. Выканаўца арганічна адчувае вобраз свайго героя і дакладна перадае яго розум, энергію, чулую і паэтычную душу. Такім чынам капітан у адстаўцы хутка заваёўвае ўсеагульную ўвагу не толькі дзеючых асоб, але і гледачоў, бо ў яго вобразе ўсе заўважаюць адметныя рысы станоўчага героя, простага, але прывабнага совецкага чалавека.

Апрача капітана Ускова ў спектаклі дзейнічае невялічкі, але цікавы калектыў совецкіх людзей, якія жывуць дзяржаўнымі, грамадскімі інтарэсамі. У гэтым калектыве — прынцыповая дзяўчына-шафёр Жэня, поўная глыбокіх пачуццяў і хараства душы (А. Глінская), імклівая сакратарша Люся (Л. Шэхтман), нясмелы ў любоўных прызнаннях і раўнівы Клаўдзінька (В. Тарасевіч), сын старога рацыяналізатара лесакамбіната Захара Дзянісавіча Камарова (І. Лойка) і яго клапатлівая жонка Ефрасіня Міхайлаўна (М. Булаткіна), урач Даніла Данілавіч (Н. Шышкоўскі). Гэта — усё жывыя і прывабныя совецкія людзі, поўныя ўнутранага хараства, чуласці і прастаты. Выкананне ўсіх гэтых ролей вызначаецца шчырасцю, праўдзівасцю і камедыйнай лёгкасцю.

Вядома, не ўсё беззаганна ў гэтым спектаклі. Наўрад ці варта суправаджаць спевы капітана, які трымае ў руках гітару, дуэтам баяна і саксафона за кулісамі. Адно не вяжацца з другім. Трэба памятаць тэатральнае правіла: калі акцёр не можа спяваць, няхай ужывае рэчытатыў. Спяванне куплетаў не ва ўсіх выканаўцаў арганічнае. Некаторым яно перашкаджае правільнаму самаадчуванню на сцэне.

Ёсць у пастаноўцы і рад іншых недахопаў, аднак яны не змяншаюць агульнага добрага ўражання ад спектакля «Капітан у адстаўцы».

Драматычны калектыў Ленінскага раённага Дома культуры Брэсцкай вобласці паказаў на аглядзе спектакль па п'есе Я. Галана «Пад залатым арлом».

Гэтая п'еса вельмі складаная і аказалася не пад сілу калектыву драматычнага гуртка. Ролі совецкіх людзей у акупіраванай амерыканцамі зоне Германіі ў пастаноўцы прыніжаны.

Нельга лічыць цалкам удалай і пастаноўку «Аленькая кветачка» (па казцы С. Аксакава) драматычнай самадзейнасцю Мсціслаўскага раённага Дома культуры, хаця спектакль і пакідае добрае ўражанне сваёй дэкарацыяй і касцюмамі. Рэжысёр П. Урублеўскі шмат увагі і творчай вынаходлівасці паклаў у пастаноўку сцэн казкі. Надзвычай цікава зроблены страшыдлы, чароўны лес, у якім нечакана расцвітае пунсовая кветка, растуць грыбы, з'яўляецца стол з ежаю і пітвом і інш. Але акцёрскае выкананне вобразаў не задавальняе, бо яно штучнае, нежыццёвае, пабудавана на дэкламацыі і найгрышы. Казачны сюжэт не азначае, што людзі, якія ў ім дзейнічаюць, павінны быць ненатуральнымі і штучнымі. Трэба і ў казцы імкнуцца да рэалістычнага раскрыцця вобразаў, да жыццёвага падабенства.

Нашы прэтэнзіі да працы самадзейных драматычных калектываў могуць здацца занадта строгімі. Могуць сказаць, што яны вынікаюць з таго, што крытыкі быццам не ведаюць пра тыя ўмовы, у якіх часам даводзіцца працаваць гуртку, і пра адсутнасць шырокага выбару п'ес і пастаянную цякучасць калектыву. Мы пра гэта ўсё ведаем і не забываем таксама, як не забываем і пра тое, што драмгурткоўцамі з'яўляюцца не прафесіянальныя акцёры, а калгаснікі, рабочыя, настаўнікі, хатнія гаспадыні, служачыя, вучні і інш. Але рост духоўнай культуры нашага народа, які карыстаецца ўсімі здабыткамі мастацтва праз тэатры, радыё, кіно, настолькі шпаркі, што нельга ад яго адставаць.

Я. РАМАНОВІЧ.

Вл. Маяковский

25 год з дня смерці

Праз глыбы гадоў

Ёсць дзве абавязковыя даты, якія з'яўляюцца межамі чалавечага жыцця. Хто з нас вымавіць «смерць», гаворачы пра чатырнаццаты дзень красавіка? Мы заўсёды скажам: Маякоўскі з намі. Нават той вясною ніхто не верыў, што змагла «смерць пасмець». Нядаўна, знаёмячыся з кнігай польскага паэта Уладыслава Бранеўскага, я прачытаў верш «14 красавіка», напісаны ў трыццатым годзе ў Варшаве:

З вечнай цемрадзі
выйшаўшы,
прагрыміць араторыя,
ім узнятая вышай,
чым
чорны дым
крэматорыя.

Жывы, нарастаючы голас Маякоўскага прабіў глыбы гадоў, мы чуем яго і нам здаецца, што гучыць ён з будучыні.

Славуты «Левы марш» створаны ў агні рэволюцыі. З ім ішлі на фронт балтыйцы па цёмных праспектах Петраграда. Праз дзевятнаццаць год яго спявалі на вуліцах Барселоны байцы рэспубліканскай Іспаніі. А праз трыццаць год «Левы марш» чыталі ў вызваленым Шанхаі байцы Народнай арміі.

Гэта хада сапраўднай паэзіі.

Сёння цяжка знайсці ў нас чалавека, які-б з курынай абывацельскай слепатой скептычна ставіўся да творчасці песняра рэволюцыі. А калі і знойдзецца такі, то гэта, пэўна, будзе наш вораг.

«Выступаць перад рускімі чытачамі з вершамі — справа, якая патрабуе вялікай адвагі. Рускі народ — гэта народ, што чытае Пушкіна і Маякоўскага», — піша Назым Хікмет.

Цяжка ўявіць і ахапіць думкай усю тую грандыёзную працу, што прарабіў Маякоўскі. Мы ведаем яго дасканалую, нібы адлітую са сталі, паэзію. Але Маякоўскі з'яўляецца і выдатным, першым совецкім драматургам: у другую гадавіну Кастрычніка ў Петраградзе ішоў спектакль па «Містэрыі-Буф» — першай совецкай п'есе. У 1918—20 гг. здымаліся першыя совецкія фільмы па сцэнарыях Маякоўскага. У 1927 годзе Ленінградскі Малы оперны тэатр ажыццявіў пастаноўку першага совецкага спектакля «Дваццаць пятага», паводле паэмы «Добра!». Маякоўскі першым з совецкіх паэтаў напісаў кніжкі для дзяцей, яны разыйшліся тыражом у дзесяткі мільёнаў. Можна яшчэ назваць выдатныя празаічныя рэчы, як «Маё адкрыццё Амерыкі», тэарэтычныя — «Як рабіць вершы» і іншыя. А тое, што напісана і намалявана для сатырычных часопісаў, для «Вокан РОСТ'а», для рэклам, — паэт лічыў сваім «другім поўным выданнем твораў».

Для выстаўкі «20 год работы Маякоўскага» ён зрабіў плакат: «Каб гэта выстаўка была больш поўнай, трэба перанесці сюды трамваі і паязды, размаляваныя баявымі радкамі, атакі, што гарланілі прыпеўкі, парканы, сцены і сцягі, што праходзілі пад Крэмлём, раскідаючы агонь заклікаў».

Сёлета ў Мінску мы глядзелі «Лазню». Гэта лепшая работа Маскоўскага тэатра сатыры. Цяжка было дастаць білеты на спектакль. «Лазня» не старэе, яна і цяпер добра мые розную погань: у зале ўвесь час чуўся смех, гучалі апладысменты.

У красавіцкім нумары часопіса «Полымя» надрукаваны пераклад феерычнай камедыі «Клоп». Моцна адсцябала гэтая камедыя «соўмяшчан», чытаеш і здзіўляешся, быццам твор напісаны спецыяльна для сёлетняга красавіцкага нумара.

Ён заўсёды адчуваў сябе заводам, які вырабляе чалавечае шчасце, працуючы па 18—20 гадзін у суткі. Гэта бяссонная варта ля калыскі новага рэволюцыйнага мастацтва — вершы, паэмы, п'есы, кіносцэнарыі, сатыра, размалёўка плакатаў і надпісы да іх, дыспуты, артыкулы, «чыстка» паэтаў, выступленні на заводах і караблях, сустрэчы з сябрамі і баі з ворагамі...

Паэзія — гэта подзвіг. Совецкая паэзія — гэта подзвіг, які пераўтварае аблічча зямлі і душу чалавека, гэта — велізарнейшая, самая цяжкая праца. Так можна сфармуляваць першы і галоўны запавет Маякоўскага. Ён адкрыў мацерыкі, якія паспяхова асвойвае сучасная паэзія. Быць падобным да яго — гэта не азначае, што трэба ступаць след у след.

Кожная рака пачынаецца з імклівага, неспакойнага ручая. Нават наша рахманая Свіслач, ідучы з Лысай гары, шуміць, рассоўвае алешнік, нажом рэжа гарбы пагоркаў, і ў яе крынічных вірах, як бліскавіца, мільгае рэдкая рыба стронга.

Вельмі-ж спакойна, на маю думку, сёння пачынаюць свой шлях нашы маладыя паэты. Чытаеш вершы, бяспрэчна, здольных людзей і здзіўляешся: так усё ў гэтых вершах правільна, гладка, быццам гэта не вершы, а вышыванне рыфмамі. У кожнай справе трэба быць наватарам. Паэтычнай моладзі варта напомніць словы наватара земляробства, народнага акадэміка Терэнція Семёнавіча Мальцэва, словы, пад якімі мог-бы распісацца Маякоўскі: «Мае паслядоўнікі павінны апярэдзіць мяне, супярэчачы мне, нават разбураючы маю працу, у той-жа час працягваючы яе. Толькі з такой работы, якая паслядоўна разбураецца, і ствараецца прагрэс».

Анатоль ВЯЛЮГІН.

Голас паэта

У адным з ціхіх маскоўскіх завулкаў, недалёка ад станцыі метро «Таганская», у невялікім двухпавярховым доміку, дзе жыў Маякоўскі, знаходзіцца бібліятэка-музей паэта. Сюды штодзённа прыходзяць экскурсанты групамі і па аднаму. Перад наведвальнікамі праходзяць дзіцячыя гады паэта ў далёкім Багдадзі, вучнёўскія гады ў Кутаісі, рэволюцыйная дзейнасць у Маскве ў 1906—10 гадах.

Падоўгу затрымліваюцца наведвальнікі ля плакатаў РОСТ'а Маякоўскага.

Рознастайныя і астатнія матэрыялы, размешчаныя ў пакоях скромнай кватэры паэта. У зашклёных стэлажах выстаўлены яго кнігі. Творы Маякоўскага выдадзены на 51 мове народаў СССР.

Недалёка стэлажы з узорамі кніг, што выйшлі за рубяжом. Па гэтых выданнях відаць, якое вялікае значэнне творчасці паэта, якая велізарная любоў да яго ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва. Яго кнігі выдадзены на 35 мовах. Раздзел «Маякоўскі на зарубежных мовах» папоўнены ўзорамі кніг, якія выйшлі ў 1954 годзе ў некаторых краінах.

Сярод запісаў наведвальнікаў словы французскага пісьменніка Луі Арагона: «Ён быў паэтам сваёй Радзімы, паэтам Кастрычніка, паэтам салідарнасці народаў. І сёння ў нашай вялікай агульнай барацьбе за мір голас Маякоўскага першы сярод паэтаў». Назым Хікмет піша: «Вялікі друг, вялікі паэт, вялікі чалавек, мой старэйшы брат Маякоўскі».

Работнікі бібліятэкі-музея сістэматызуюць цяпер адабраныя з фондаў музея шматлікія запіскі, якія Маякоўскі атрымліваў ад сваіх слухачоў у час выступленняў. Іх мноства. Можна ўказаць хоць-бы на тое, што ў час выступленняў у соўпартшколе ў Мінску ў 1927 г. ён адказаў на 191 запіску.

Дваццаціпяцігадовая дата з дня смерці пісьменніка адзначаецца ў Маскве вельмі шырока. 17 красавіка будзе праведзены традыцыйны вечар у Політэхнічным музеі, дзе асабліва часта выступаў Маякоўскі. На гэтым масавым вечары будзе ўпершыню заслуханы магнітафонны запіс выступленняў паэта і сярод іх малавядомы запіс — «А вы маглі-б?». На літаратурных вечарах, якія па рашэнню камісіі, якая ўзначальваецца Н. Асеевым, працягнуцца ў Маскве да 22 красавіка, будзе ўпершыню паказаны шырокай аўдыторыі фільм, пастаўлены па сцэнарыю і з удзелам Маякоўскага «Настаўніца рабочых» («Паненка і хуліган»).

16 красавіка арганізоўваецца спецыяльны вечар на тэму «Паэт аб правадыру» з чытаннем раздзелаў з паэмы «Владзімір Ільіч Ленін». Тут выступяць буйнейшыя майстры мастацкага слова. Да гэтага вечара адкрыецца выстаўка розных выданняў паэмы.

Дваццаціпяцігадовая дата з дня смерці Маякоўскага адзначаецца таксама ўрачыстым адкрыццём трохметровай бронзавай скульптуры В. Маякоўскага работы маладога грузінскага скульптара Гурама Кардзахія. Скульптура ўстанаўліваецца перад будынкам дзяржаўнай бібліятэкі-музея В. Маякоўскага.

Другі помнік — скульптурная фігура В. Маякоўскага, створаная вядомым скульптарам А. Кібальнікавым, павінен быць узведзены ў Маскве на плошчы, што носіць імя паэта. Хутка будзе закончана рэканструкцыя і забудова паўночна-заходняй часткі плошчы Маякоўскага, і велічны помнік паэту паўстане на гэтай плошчы — адной з самых прыгожых у сталіцы.

І. ХАРЫТОНАЎ.
(Наш кар.).

Масква.

Жывы з жывымі

Усе неадкладныя запатрабаванні і патрэбы совецкага жыцця знайшлі свой жывы і непасрэдны водгук у творчасці Маякоўскага. Ён выказваў вершам тое, чаго нельга было не выказаць, што, быццам сама неабходнасць, не магло не з'явіцца на свет, не загучаць на ўвесь голас. Таму вострая надзённасць — адна з самых характэрных рыс яго паэзіі. Ён імкнуўся адлюстраваць у сваёй творчасці кожны наш дзень. І паколькі гэтыя дні роўныя па свайму значэнню цэлым эпохам, яны патрабавалі, з аднаго боку, узнёслай рамантыкі і магутнага трыбуннага закліку да ўзбуджаных рэволюцыйных мас, а з другога — вострага сатырычнага слова. У Маякоўскага «і песня, і верш — гэта сцяг наш і бомба». Яго верш змагаўся і змагаецца не на жыццё, а на смерць з ворагамі рэволюцыі. Іронія, сатыра, сарказм — вось тая смертаносная зброя, з якою паэт пасылаў войскі сваіх радкоў на перадавую.

Амаль усе вершы Маякоўскага былі напісаны на патрэбу дня, на патрэбу свайго часу. Той дзень, той час, які апаэтызаваў Маякоўскі, даўно адышоў у мінулае. Чаму-ж вершы яго не ўстарэлі? Чаму і сёння яны гучаць гэтак-жа надзённа, як і пры першым сваім з'яўленні, а часта яны хвалююць нас цяпер яшчэ больш?..

Маякоўскі ненавідзеў, як толькі можа ненавідзець совецкі грамадзянін, тых, хто «вокам у сваё карыта ўпіраецца старанна». Але таго, хто «ўсю зямлю акідваў зрокам, бачыў тое, што ў вяках схавана», Маякоўскі любіў усім сэрцам. У Леніне, якому прысвечаны гэтыя радкі, паэт бачыў увасабленне ўсёй нашай рэволюцыі, усяго нашага сучаснага і будучага. Гэта бязмежнае, незгасальнае пачуццё любві да Леніна, да партыі, да рэволюцыі, да Радзімы дапамагала паэту ў кожнай драбніцы дня ўбачыць зерне будучыні, убачыць і адчуць усё тое значнае, што будзе надзённым і заўтра, і паслязаўтра, і праз многа-многа год. Толькі яна, гэтая бязмежная любоў да Радзімы, і змагла зрабіць неўміручай паэзіяй кожную, дарагую сэрцу паэта, з'яву нашага соцыялістычнага жыцця, кожную нават, часам, нязначную падзею дня напоўніць глыбокім сэнсам.

Маладосць не можа існаваць без самай адданай, самай цеснай і шчырай дружбы. Ніхто так, як Маякоўскі, не ўмеў паэтызаваць дружбу, ніхто так з'едліва не іранізаваў над тымі, хто эгаістычна супрацьпастаўляў сябе калектыву. Гэтае пачуццё дружбы, якое, перш за ўсё, вызначае совецкіх людзей, пранізвала ўсю істоту паэта.

Маладосць надзвычай шчодрая. Такі-ж шчодры і Маякоўскі. Сваім маладым сябрам, сваім нашчадкам ён аддаваў усё, чым валодаў сам, — рыфмы, тэмы, дыкцыю, бас. Бярыце ўсё, казаў ён маладым паэтам, усё гэта ваша. Але, аддаючы гэта, ён папярэджваў, каб пачынаючыя паэты былі такімі-ж, як сама маладосць, патрабавальнымі да прыгажосці ў жыцці, да фізічнага і духоўнага хараства, каб яны не мірыліся са штучнасцю, аднастайнасцю. Самае галоўнае, казаў Маякоўскі, гэта ўменне знаходзіць сваё ў паэзіі, нікога не перапяваць. Больш паэтаў добрых і розных — вось яго дэвіз. Таму і вучобу ў класікаў ён разумеў, перш за ўсё, як упартыя і нястомныя пошукі свайго самастойнага паэтычнага шляху.

Я часта задумваюся над прычынамі няўдач і правалаў, якія здараюцца з тымі, хто імкнецца знешне быць падобным на Маякоўскага. Гэтыя няўдачы і правалы сведчаць аб няправільным разуменні вучобы ў Маякоўскага.

Вялікі паэт выношваў кожны такт, кожны пераліў рытма ў сабе, пакуль гэты рытм не станавіўся арганічным усёй яго істоце, пакуль ён не падпарадкоўваўся яго і толькі яго інтанацыі. Маякоўскі не браў напракат чужых рытмаў, папярэдне не «пераварыўшы», не напоўніўшы іх гучаннем свайго голасу.

Мне думаецца, што быць дастойным вучнем Маякоўскага, вартым яго, гэта значыць — шукаць, як шукаў ён; знаходзіць сябе, як умеў рабіць гэта ён; не задавальняцца дасягнутым, як не задавальняўся ён. Толькі тады і можна быць такім-жа востра надзённым, неабходным і сёння, і заўтра, і праз многа гадоў, якім з'яўляецца Владзімір Маякоўскі.

Дзмітрый КАВАЛЕЎ.

Літаратурныя вечары

✦ Вечар памяці В. Маякоўскага арганізавала абласная бібліятэка на Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя Кірава. З дакладам аб жыцці і творчым шляху паэта выступіў Д. Палітыка. Рабочы К. Жэрабіла прачытаў вершы «Падліза», «Расказ ліцейшчыка Івана Козырэва аб усяленні ў новую кватэру», урыўкі з паэмы «Владзімір Ільіч Ленін», тэхнолаг інструментальнага цэха Ул. Усікаў — «Верш аб совецкім пашпарце».

У заключэнне адбыўся канцэрт удзельнікаў мастацкай самадзейнасці Брэсцкай вобл.

✦ У Беларускім дзяржаўным універсітэце імя В. І. Леніна адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны 25-годдзю з дня смерці В. Маякоўскага.

На факультэцкім літаратурным вечары фізмата дацэнт А. Нахімоўская, якая слухала Маякоўскага ў час яго выступленняў у Мінску, падзялілася са студэнтамі ўспамінамі аб паэце.

✦ 18 красавіка ў Мінску адбудзецца агульнагарадскі вечар, прысвечаны памяці паэта, на якім з уступным словам выступіць П. Броўка. Даклад аб жыцці і творчасці В. Маякоўскага зробіць А. Бачыла. Паэты прачытаюць творы В. Маякоўскага ў перакладзе на беларускую мову.

Владзімір МАЯКОЎСКІ — Пасланне пролетарскім паэтам

Таварышы,
дазвольце,
без выпадаў рэзкіх,
але
па-таварыску,
не тоячы нічагуткі,
паразмаўляю з вамі,
таварыш Безыменскі,
таварыш Светлоў,
таварыш Уткін.
Мы спрачаемся,
аж глоткі просяць абновы,
мы
задыхаемся,
на эстрадах здзіўляючы свет,
а ў мяне да вас, таварышы,
дзелавая прапанова:
давайце,
наладзім
вясёлы абед!
Рассцелем унізе
кампліменты дармовыя,
калі зуб на каго —
адпілуем зуб;
раздадзеныя
Луначарскім
вянкі лаўровыя
складзем
у агульны
таварыскі суп.
Згодзімся,
што кожны
прыдатны да справы.
Кожны спявае
па свайму
галаску!
Разрэжам
агульную курыцу славы
і кожнаму
выдзелім
па роўнаму куску.
Кіньма
ўзаемна
шпількі падсоўваць,
развядзем
далікатны
слоўны ажур.
А калі мне
таварышы
дазволяць слова, —
я гэтае слова вазьму
і скажу:
— Я вам уяўляюся
акадэмікам
з тоўстым задам,
адзін, маўляў, я
жрэц
паэзій шыкозных.
А мне
ў сапраўднасці —
адно толькі радасць:
каб больш паэтаў
добрых
і розных.
Многія
выхваляюцца
позай змагарскаю,
і як-жа, на жаль,
гэты выхвал
жывучы!
— Мы, знайце, адзіныя,
мы пролетарскія... —
А я, па-вашаму, што —
валютчык?
Я —
майстравы,
і магу прызнацца:
не люблю я
гэтай філасофіі нуднай.
Закасаю рукаўчыкі:
працаваць? змагацца?
Зрабі, браце, ласку,
а ну, давай!
Ёсць
перад намі
вялізная работа —
сказаць чалавеку —
куды і як ісці.
Давайце працаваць
да сёмага поту
над узняццем колькасці,
над паляпшэннем якасці.
Я
вершаў гатункі
па комуне
цаню,
па комуне
мераю
вартасць дня.
Бо комуну
ўяўляю
як вялізную вышыню,
бо яна —
па-мойму —
найглыбейшая глыбіня.
А ў паэзіі
няма
ні сяброў, ні сыноў, —
па пратэкцыі
не звяжаш
рыфмаў лычкі.
Пакінем
размеркаванне
ордэнаў і чыноў,
кінем, таварышы,
наклейваць ярлычкі.
Не хачу
пахваліцца
думкай новенькай,
але ўпэўнен —
сцвярджаю з уздымам веснім —
комуна —
гэта месца,
дзе знікнуць чыноўнікі,
і дзе многа
будзе
вершаў і песняў.
Варта
захапіцца
рыфмачак парай нам —
мы абвяшчаем паэціка геніем.
Аднаго
называюць
чырвоным Байранам,
другога —
самым чырвоным Гейнем.
Аднаго баюся —
за вас, і сам, —
каб не абмяльчэлі
нашы душы,
каб мы
не ўзвялі
ў комуністычны сан
тупасць раешнікаў
і драбязу частушак.
Мы духам адно,
разумееце самі:
няма
падзелу
па лініі сэрца.
Калі
вы не за нас,
а мы
не з вамі,
дык чорта-ж
нам
рабіць застаецца?
А калі я
вас
не шаную парою,
і на вас
замахваецца
пяро-рука,
дык гэта здабыў я,
як кажуць,
крывёю,
болей,
чым вы,
паслужыў я радкам.
Таварышы,
гандлярскіх
не трэба
замашак:
— Мая, бач, паэзія —
мой лабаз! —
Усё, што зрабіў я,
усё гэта ваша —
рыфмы,
тэмы,
дыкцыя,
бас!
Зусім не аб славе
мае летуценні.
У труну яе браць мне
ці што,
як памру?
Напляваць мне, таварышы,
ў вышэйшай ступені
на грошы,
на славу
і на іншую муру!
Чым весці
аб паэтычнай уладзе
размовы,
давайце
без зайздрасцяў
і выхвалення імён
у будоўлю комуны
цагліны-словы
класці —
для будучых
вялікіх дзён.
Адна
у нас
мэта,
адна дарога.
Нам не трэба
бурчлівага
лысага парыка!
А лаяцца захочацца —
ворагаў многа
па другі бок
чырвоных барыкад.

1926.

Пераклаў Кастусь КІРЭЕНКА.

Маякоўскі аб сабе

Заметкі да аўтабіяграфіі паэта «Я сам»

Ужо самы спосаб выкладання сваёй аўтабіяграфіі Маякоўскім гаворыць аб яго прынцыповым нежаданні спыняцца на падрабязнасцях, здрабняць сваё апавяданне нязначнымі дэталямі. Такім ён быў і ў жыцці, сціслым і яркім у сваіх энергічных выказваннях па самых рознастайных выпадках — ці гэта меркаванне аб літаратуры, аб палітычнай падзеі ці аб чымнебудзь будзённым.

«Даволі вам вала круціць», — перапыняў ён тэарэтычную спрэчку, якая зацягнулася, або апавяданне з непатрэбнымі падрабязнасцямі. «Вала круціць» — азначала замаруджваць, няясна выказваць сваё меркаванне. Сціслацці і дакладнасці выказвання ён аддаваў перавагу перад усялякай красамоўнай шматслоўнасцю. Але гэта зусім не азначала сухасці і беднасці мовы. Сціслась і яркасць выказвання дасягалася ім у нечаканым звароце мовы, у дзіўным на першы погляд супастаўленні, у дасціпным выразе, які абяззбройваў супраціўніка. Таму і ў яго пісьмовай мове амаль няма разыходжання з вуснымі выказваннямі, якія вызначаліся непаўторнай своеасаблівасцю. Ён заўсёды імкнуўся гаварыць «весомо, грубо, зримо».

Пачынаючы з загалоўка «Я сам», — усё у гэтай аўтабіяграфіі незвычайнае. Я думаю, што сама гісторыя гэтага загалоўка вядзе нас да раскрыцця яго асобы, да першапачатковага часу фармавання яго літаратурнага аблічча.

Справа ў тым, што яшчэ да рэволюцыі рэакцыйны пісьменнік Мерэжкоўскі крычаў аб «будучым хаме», як ён у сваёй звярынай нянавісці да народа абзываў рэволюцыю. Маякоўскі яшчэ тады даў адказ гэтым злосным выпадам баязлівага буржуазнага прапаведніка, назваўшы адно са сваіх выступленняў — «Будучы Сам».

«Сам» у разуменні Маякоўскага быў народ, гаспадар свайго лёсу, сваёй будучыні.

Называючы сваю аўтабіяграфію «Я сам», Маякоўскі, думаю, надаваў той-жа сэнс гэтаму загалоўку, падкрэсліваючы сваю блізкасць да лёсу народа, непарыўнасць сваёй творчасці з тым, чаго, у першую чаргу, чакаў народ ад мастацтва.

Таму ён і высоўвае на першы план прафесіянальнае аблічча паэта, адводзячы на другі ўсё асабістае, штодзённае. Маякоўскі гаворыць аб тым, што фармавала яго як рэволюцыйнага паэта-трыбуна. Кароткі сказ, які часта складаўся з аднаго або двух слоў, як-бы падкрэсліваў, што паэт гаворыць аб самым галоўным. Так, напрыклад, апавядаючы аб смерці бацькі, які ў многім перадаў свае рысы характару сыну, Маякоўскі піша: «Памёр бацька. Укалоў палец (сшываў паперы). Заражэнне крыві. З таго часу цярпець не магу шпілек».

Так гранічна коратка сказана аб адным з найбольш значных уражанняў маленства. Але за сціслацю апісання адкрываецца вялікая падзея. «З таго часу цярпець не магу шпілек». Не толькі шпілек, але і ўсякай дробязі, дробнасці, мільгаючых уражанняў. Дробных уколаў, звадак, «дробязнага рою» падзей, якія засланяюць, завалакваюць галоўнае.

Так будуецца і сказ, які раскрывае свет яго душы.

Трэба адзначыць некаторыя своеасаблівыя рысы яго аўтабіяграфіі, якія няясна выступаюць з ацэнкі іх крытыкамі. Справа датычыць яго вонкавага выгляду, які палохаў сваёй «жоўтай кофтай», экстравагантнасцю як яго сучаснікаў, так і паслядоўнікаў.

«Касцюма ў мяне не было ніколі», — піша ён аб тым часе. Гэта і было адной з прычын, што выклікалі на свет з'яўленне аксесуара адзення Маякоўскага, які так абураў абывацеляў.

Але — толькі адной з прычын. Варта ўспомніць, чым, уласна, была гэтая кофта. Была яна з выгляду звычайнай па крою блузай, якія насілі мастакі ў час работы. Незвычайнай была толькі яе расфарбоўка, якая складалася з чорных і жоўтых падоўжных палос, даволі шырокіх, пальцы на чатыры ўшырыню. Не толькі адсутнасцю касцюма тлумачылася яе з'яўленне. Мне думаецца, што пратэст супраць абязвечвання, абязлічвання быў выклікам з боку паэта абывацельскаму густу, які дыктаваў шэрыя прыглушаныя тоны, што не вылучаліся з агульнага фону шэрасці і бескаляровасці. Пасля рэволюцыі 1905 года былі ў модзе стушаванасць, затуханне, заміранне, ціхія галасы, няяркія тоны.

Шэрыя шторы, шэрыя твары, сцятыя губы, туманныя далячыні, дымка і флёр, накінутыя тады заканадаўцамі густаў на рэчаіснасць, — вось што парушала ўбранне Маякоўскага сваёй рэзкай расфарбоўкай. Сам Маякоўскі зведаў астракізм, як паэт, іменна за парушэнне правіл «добрага тагачаснага тону», за супрацьдзеянне «правілам прыстойнасці», хоць па сутнасці нічым, апрача яркай плямы, яго блуза не была. Маякоўскі, прыцягваючы ўвагу да яе дзівацкай расфарбоўкі, адводзіў гэтую ўвагу ад сутнасці сваіх выступленняў, ад сапраўднага значэння сваіх вершаў.

Жывая рэклама сваёй справы, — Маякоўскі, — быў нібы дрэўкам флага, да якога сыходзілася моладзь, каб паслухаць і паглядзець на зусім не такога, як да гэтага часу было, паэта.

Такой-жа дэманстрацыяй супраць абывацельскага густу, супраць звыклых эстэтычных разуменняў была і назва паэмы «Боблака ў штанах».

Аднак гэтая здзеклівая назва, якая замяніла першапачатковую, забароненую цэнзурай, была вопытам вялікай тэмы.

Далоў вашу любоў, далоў вашу ідэалогію, далоў ваш побыт — вось устаноўкі гэтай тэмы, у якой яшчэ ясна заўважаецца выкрывальны ўплыў талстоўскага генія. Наогул пытанне аб уплыве Льва Талстога, у прыватнасці «Уваскрэсення», на маладога Маякоўскага зусім не асветлена ў нашым літаратуразнаўстве. А ўплыў гэты адчуваецца бяспрэчна; ды і як магло яго не быць, калі ўвесь пачатак стагоддзя быў абавязаны Льву Талстому велізарнасцю яго адмаўлення існуючага.

Забываюцца або не прымаюцца пад увагу тыя адценні сэнсу, які ўкладзены ў многія радкі Маякоўскага першага перыяду яго паэтычнай дзейнасці.

Бо нават у прадказаным Маякоўскім прыходзе рэволюцыі гучыць тое самаахвяраванне, якое так часта ўзнікае ў творчасці Талстога.

Справа, вядома, не ў тым, каб паказаць маладога Маякоўскага талстоўцам. Ўплыў Талстога на творчасць Маякоўскага зусім не рашаючы. Але гэта адзін з уплываў, які фармаваў яго творчасць якраз па метаду, блізкаму творчасці Талстога. Метад гэты ў паказе рэчаў і з'яў не такімі, якімі яны ўспрыймаюцца звычайна, а такімі, якімі яны становяцца ў сваім змяненні.

Змена рэчаў і падзей для Маякоўскага — галоўнае поле яго творчага вопыту. Асноўны прынцып яго літаратурнай работы: ніколі не спыняцца на дасягнутым, а заўсёды імкнуцца да новых адкрыццяў і вынаходстваў у слове, у вершы, у гучанні, кіруючыся нязменным законам жыцця — адчуваць і прадбачыць будучыню.

У прадмове да «Усяго, створанага Маякоўскім», ён піша:

«Хутка зробленае мною стане азбукай, якая не творыцца, а развучваецца. Пакідаючы напісанае школам, адыходжу ад зробленага і толькі пераступіўшы цераз сябе, выпушчу новую кнігу».

І кожная новая яго кніга ўражала непадобнасцю на зробленае раней. На самай справе: хіба «Воблака» падобна на «150.000.000»? А «Містэрыя-Буф» хіба не здаецца напісанай іншым чалавекам? Параўнайце хоць-бы «Добра!» і «Пра гэта», «Вайну і мір» з сатырычнымі вершамі, «Першую трагедыю» з «Лазняй» і вы ўбачыце, што не пустымі словамі былі яго заявы аб зменнасці мастацкіх сродкаў, аб рознастайнасці інтанацый, якімі валодаў і якія ўжываў Маякоўскі ў сваёй творчасці. І адно было нязменным і непарушным — вера ў лепшую будучыню чалавецтва, вера ў свой народ, у сваю краіну, у сваю партыю.

Нікалай АСЕЕЎ.

На мовах народаў свету

Літаратурныя выстаўкі, прысвечаныя жыццю і творчай дзейнасці В. Маякоўскага, адкрыты ў многіх бібліятэках Мінска. Цікавая і змястоўная выстаўка ў чытальнай зале Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя В. І. Леніна. Тут сярод шматлікіх кніг паэта, выдадзеных на многіх мовах свету, асобныя выданні твораў В. Маякоўскага ў перакладзе на беларускую мову.

Вялікае месца на выстаўцы займаюць раздзелы «Маякоўскі аб міры», «Маякоўскі аб Радзіме», «Маякоўскі аб моладзі», «Маякоўскі дзецям».

У раздзеле «Літаратура аб Маякоўскім» сабраны багаты бібліяграфічны матэрыял аб жыцці і творчым шляху В. Маякоўскага як паэта, драматурга, мастака і крытыка. Побач — плакаты, якія характарызуюць паэта як палымянага барацьбіта за мір ва ўсім свеце.

Старонкі незабыўнай барацьбы

Маладая дзяўчына бегла па вуліцах Мінска. Быў канец красавіка, і хоць горад ляжаў у руінах і знаходзіўся яшчэ ў руках акупантаў, надыход вясны адчуваўся і тут. Дзяўчына «ўсміхалася кожнаму дрэву, якое нясмела выпускала свае пупышкі. «Перанеслі ўсё, мае любыя, — з пяшчотнасцю думала яна пра маладыя дрэўцы, пасаджаныя перад самай вайной па Маскоўскай вуліцы. — Цяпер чакаць не доўга. Мабыць, апошнюю вясну гібееце».

Дзяўчына гэтая — Ніна Ляльчук, адна з падпольшчыц Мінска, былая студэнтка педагагічнага інстытута. Яна працуе кельнершай начнога буфета ў Генеральным камісарыяце. Сёння яна павінна выканаць адказнае заданне падпольнага цэнтра і пакінуць горад. Таму на сэрцы ў яе — і трывога, і радасная надзея.

У Генеральным камісарыяце адбываецца важная нарада. Новы гауляйтэр фон Готберг, які замяніў знішчанага падпольшчыкамі Кубэ, рыхтуе, па асабістаму загаду фюрэра, аперацыю па ліквідацыі партызан у тыле Цэнтральнай групы фашысцкіх войск. План аперацыі названы ў гонар надыходзячага вялікадня—«вясновае свята». Усё ў Готберга і яго падручных разлічана так, каб на працягу тыдня поўнасцю знішчыць злучэнне партызанскага генерала Бярозіна.

Позна ўначы, калі афіцэр асобага прызначэння Таўбэ перад тым, як вылецець у Бабруйск з загадам, падсілкоўваецца ў буфеце Генеральнага камісарыята, супольнік Ніны па падполлю буфетчык Іваноў робіць на яго ўдалы замах і, перадаючы Ніне планшэт з дакументамі, наказвае: «Кірава, 68... Запомні! Чакае шафёр. Хутчэй!»

«Звычайная завязка прыгодніцкага твора з часоў Вялікай Айчыннай вайны», — скажа, магчыма, той-сёй, прачытаўшы такі пачатак аповесці Георгія Шчарбатава «Ёсць на свеце Масква» («Полымя» № 3 за 1955 г.). Але чытаючы далей, ён пераканаецца, што гэта далёка не так. Перад намі аповесць, напісаная ў рэалістычным плане, аб людзях і падзеях, праўдзівасць якіх не выклікае сумнення, нягледзячы на тое, што гэта не дакументальны, а мастацкі твор.

Кожны новы твор на партызанскую тэму мы сустракаем цяпер з некаторай насцярожанасцю: што новага ён дадасць да таго, што паказана ўжо ў шматлікіх кнігах аб партызанскім руху на Беларусі — аповесцях, раманах, запісках, успамінах? Літаратура на гэтую тэму даволі багатая. Але-ж і тэма невычэрпная! Да яе, зусім натуральна, звяртаюцца і яшчэ доўгі і доўгі час будуць звяртацца нашы пісьменнікі.

Аповесць «Ёсць на свеце Масква» паказвае напружаную, драматычную старонку партызанскай барацьбы, калі вясной 1944 года гітлераўцы кінулі вялізныя, узброеныя першакласнай тэхнікай сілы на ачыстку свайго тылу. Вораг ішоў у партызанскія зоны, спальваючы вёскі, знішчаючы насельніцтва, ператвараючы цэлыя раёны ў пустэчы. Такім быў і план, другога пасля Кубэ ката беларускага народа, фон Готберга пад здзекліва-паэтычнай назвай «вясновае свята».

Але партызаны былі ўжо не тыя, як у першыя гады вайны. Цяпер гэта была магутная, па-вайсковаму арганізаваная сіла, якая абапіралася на актыўную падтрымку ўсяго народа і атрымлівала сістэматычную дапамогу і кіраўніцтва з-за фронта, з Масквы.

Ніна Ляльчук да гэтага не была ў партызанах і хоць не верыла плёткам фашысцкай прапаганды аб іх, прыемна здзівілася, убачыўшы па-вайсковаму падцягнутых народных мсціўцаў, вясёлых і простых у быту, дысцыплінаваных і адважных у баявой абстаноўцы. Аўтар уводзіць нас у асяроддзе партызан, у баявое, кіпучае жыццё партызанскага злучэння, якім кіруе былы сакратар абкома Бярозін.

Мы паступова знаёмімся з людзьмі злучэння, пачынаючы ад радавых партызан і канчаючы камандзірамі брыгад і самім камандуючым. Усё гэта людзі, якіх вайна адарвала ад мірнай стваральнай працы. Малады партызан Лявон Муравейка, зірнуўшы на палі і паскробшы далоні, з чалавечай цеплынёй гаворыць сябрам на партызанскай заставе:

— Свярбяць... Узяцца-б цяпер за плуг ды босаму па цёплай баразне, а шпакі за табой, як пісклятьі за квактухай.

Весткі, якія прынесла з Мінска ў партызанскае злучэнне Ніна Ляльчук, не з'яўляюцца навіной для Бярозіна, але яны ўдакладняюць планы фашысцкага камандавання. Ёсць два выхады са становішча, у якім апынулася злучэнне: першы — вывесці баявыя сілы з блакады, але гэта азначае пакінуць фашыстам на расправу дзесяткі тысяч мірных людзей, і другі — не пакідаючы раёна, манеўраваць у лясах і балотных масівах, знясільваючы ворага ў працяглых баях.

Сабраўшы нараду камандзіраў брыгад, Бярозін выбірае другі варыянт, які неўзабаве ўхваляецца Цэнтральным штабам партызанскага руху.

З хваляваннем мы сочым за зыходам паядынку двух сіл — сілы, акрыленай народным гневам і ўпэўненасцю ў справядлівасці сваёй справы, і сілы, якая хоць і з'яўляецца яшчэ грознай, але асуджана на пагібель. Нялёгка было партызанам у гэтых баях, аднак іх мужнасць і самаадданасць і падтрымка ўсёй вялікай Радзімы не маглі не забяспечыць ім перамогі.

Чалавеканенавісніцкае «вясновае свята» акупантаў было сарвана. Сам фон Готберг ледзь уцёк на самалёце з партызанскага акружэння. Партызаны пасля баёў урачыста адсвяткавалі сваё свята — дзень Першага мая 1944 года.

Час, які ахоплівае аповесць, кароткі — адзін тыдзень. Але гэты тыдзень напоўнены шматлікімі імклівымі падзеямі, у якіх выяўляюцца характары людзей і акрэсліваецца агульная карціна ўсенароднай барацьбы супраць акупантаў. Аўтар здолеў пабудаваць дынамічны, займальны сюжэт і ў той-жа час пазбег павярхоўнасці і схематычнасці ў абмалёўцы сваіх асноўных герояў, іх гісторый, іх лёсу.

Жыццёва-праўдзівымі нам здаюцца і карціны партызанскага быту, і гісторыя кахання Ніны Ляльчук і былога саліста ансамбля песні і танца Віктара Таміліна, цяперашняга ад'ютанта камандзіра злучэння, і мужнасць жонкі сакратара райкома Дулебы ўрача Антаніны Міхайлаўны, на вачах якой эсэсаўцы вешаюць яе васьмігадовага сына, і паводзіны асобных партызан і іх камандзіраў у час баёў.

Большасць герояў у аповесці надзелены індывідуальнымі рысамі, яны паўстаюць перад намі, як жывыя—засяроджаны, высакароднай душы і вялікай вытрымкі Бярозін, сівабароды «бацька», начальнік разведкі Палаўчэня, былы каваль, славуты «кароль засад» камандзір брыгады «Буравеснік» Ігнат Пушча, радавыя партызаны Мікола Багун, Лявон Муравейка, Піліп Кукарэка, украінец Шумідуб, памочнікі партызан — мясцовыя жыхары.

Чытаючы аповесць, мы яскрава адчуваем атмасферу таго баявога, гераічнага часу, поўную напружанасці і трывог, бачым зямлю, якую так мужна адстайвалі партызаны, — вёскі, палі і лясы, балотныя масівы з пакрытымі сасняком астраўкамі, дзе размешчаны буданы і зямлянкі. І над усім гэтым распасцірае крылле вясна. Як непазбежны надыход вясны, так непазбежная і перамога над ворагам — такая думка як-бы пранізвае аповесць.

Праўда, месцамі Г. Шчарбатаў не ўтрымаўся ад спакусы яшчэ больш завастрыць сюжэт, «уразіць» чытача нечаканасцямі. Такой нечаканасцю з'яўляецца смерць Ніны Ляльчук. Ні з пункту гледжання развіцця вобраза, ні псіхалагічна ў даным выпадку не апраўдана смерць Ніны Ляльчук.

Чамусьці толькі пад канец аповесці, у час сустрэчы Ніны з Таміліным, мы даведваемся, што Ніна Ляльчук — гэта падпольная клічка, а сапраўднае імя і прозвішча дзяўчыны Наташа Лунец. Аўтар павінен быў раней сказаць аб гэтым, бо чытач прывык да Ніны Ляльчук, і запозненае «адкрыццё» выклікае ў яго проста здзіўленне.

Нельга не заўважыць некаторага шаблону ў партрэтных характарыстыках ворагаў — пераважна сухапарых або тоўстых і ў большасці п'яных.

Побач з выразна выпісаным вобразам здрадніка, былога кулака Сяміздрава аўтар выводзіць карыкатурны тып другога фашысцкага паслугача, заўсёды п'янага, з п'яным трызненнем, паэта-нацдэма Максіма Палына. Калі і трапляліся ў жыцці такія нягоднікі, дык яны, як і гэты Максім Палын, не іграліі якой-небудзь значнай ролі ў барацьбе і наўрад ці варта «ажыўляць» імі сур'ёзны і цікавы твор. Празаіку трэба больш клапаціцца і аб мове, не ўжываць шэрых, газетных выразаў і слоў.

«Ёсць на свеце Масква» — другая кніга Георгія Шчарбатава аб партызанах. Першая — «Партызанскія агні» — выйшла ў свет у 1950 г. Гэта былі дакументальныя запіскі ўдзельніка партызанскага руху. Аповесць-жа — бясспрэчны крок наперад ў творчым росце пісьменніка. Яна таксама — пераканальны доказ таго, якой невычэрпнай і заўсёды свежай крыніцай для творчасці з'яўляецца гераічная барацьба беларускага народа з фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Тарас ХАДКЕВІЧ.

Перавыбарчы сход секцыі прозы

Справаздачны даклад А. Кулакоўскага на сходзе секцыі празаікаў, які адбыўся гэтымі днямі, выклікаў ажыўленыя спрэчкі. Пісьменнікі Ул. Карпаў, М. Паслядовіч, І. Гурскі, П. Броўка, Т. Хадкевіч, А. Міронаў, П. Кавалёў, М. Ткачоў, І. Шамякін, Я. Брыль, М. Лынькоў гаварылі, што секцыя ў апошні год паслабіла сваю работу. За ўвесь год праведзена ўсяго тры сходы і некалькі пасяджэнняў бюро, прычым з новых твораў празаікаў абмеркавана толькі аповесць Я. Брыля «На Быстранцы». Секцыя занядбала добрую практыку мінулых гадоў, калі амаль кожны буйны твор абмяркоўваўся перад надрукаваннем, і гэта, бясспрэчна, прыносіла карысць як аўтару, так і ўдзельнікам абмеркавання.

Не ўзнімаецца ў секцыі цікавых творчых праблем, якія выклікалі-б дыскусіі, абуджалі творчую думку. Секцыя не ўзяла пад свой кантроль нават такую важную справу, як стварэнне кнігі нарысаў аб перадавіках сельскай гаспадаркі рэспублікі.

Шмат увагі ў выступленнях было аддадзена пытанням выхавання маладых празаікаў, клопаты аб якіх павінны займаць значнае месца ў рабоце секцыі.

Сход выбраў новае бюро секцыі, у якое ўвайшлі М. Лынькоў, І. Гурскі, Я. Брыль, М. Паслядовіч, П. Кавалёў, Т. Хадкевіч, Ул. Карпаў. Старшынёй секцыі выбраны Янка Брыль.

Бібліяграфія твораў Янкі Купалы

Да пяцідзесяцігоддзя з дня першага выступлення Янкі Купалы ў друку, якое споўніцца 28 мая, музей народнага паэта падрыхтаваў зборнік матэрыялаў аб яго жыцці і літаратурнай дзейнасці і поўную бібліяграфію яго твораў.

Першая частка «Бібліяграфіі твораў Янкі Купалы», складзеная супрацоўнікамі музея Ул. Луцэвіч і Н. Кудраўцавай, ужо выйшла ў выдавецтве Акадэміі навук БССР. Яна ахоплівае дакастрычніцкую творчасць паэта і рэгіструе ўсе вядомыя да гэтага часу публікацыі яго твораў, напісаных да Кастрычніцкай рэволюцыі.

У «Бібліяграфіі» ўказаны псеўданімы Я. Купалы, дадзены падрабязныя звесткі аб першых публікацыях яго твораў у дакастрычніцкім і ў беларускім совецкім друку і анатаваныя спісы асобных выданняў твораў. Кніга дае бібліяграфічнае апісанне перакладаў Я. Купалы з рускай, украінскай і польскай моваў, а таксама перакладаў яго твораў на рускую, украінскую, польскую і чэшскую мовы. У асобным раздзеле прыводзіцца спіс выданняў, у якіх друкаваўся Я. Купала да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Кніга мае алфавітны даведнік твораў і перакладаў паэта.

«Бібліяграфія» з'яўляецца каштоўным дапаможнікам у вывучэнні літаратурнай спадчыны Янкі Купалы.

Новы спектакль

Днямі Магілёўскі абласны драматычны тэатр паказаў новы спектакль па п'есе А. Штэйна «Персанальная справа». Пастаноўка ажыццёўлена галоўным рэжысёрам тэатра, заслужаным артыстам БССР В. Шутавым. Дэкарацыі выкананы па эскізах мастака В. Тамань.

Хутка магіляўчане пазнаёмяцца з новай, пятай работай тэатра ў бягучым сезоне — са спектаклем па п'есе В. Гусева «Іван Рыбакоў». Ставіць спектакль малады рэжысёр, выпускнік Ленінградскага тэатральнага інстытута М. Генін.

А. СІМАНАЎ.

Маладыя мастакі

На выстаўцы дыпломных работ студэнтаў мастацкіх інстытутаў СССР

У Мінскім акруговым Доме афіцэраў адкрылася перасоўная выстаўка дыпломных работ студэнтаў мастацкіх інстытутаў СССР. На выстаўцы экспануецца да 200 твораў жывапісу, графікі і тэатральна-дэкаратыўнага мастацтва.

Выстаўка знаёміць гледачоў з творчым узроўнем маладых мастакоў, якія атрымалі адпаведную падрыхтоўку ў сценах мастацкіх вышэйшых навучальных устаноў краіны пад кіраўніцтвам вопытных майстроў старэйшага пакалення.

Сталым майстэрствам задумы і выканання вылучаецца жывапіснае палатно дыпломніка Кіеўскага інстытута А. Ілюшына «На этапе». Малады мастак здолеў вельмі пераканальна перадаць вобраз вялікага мысліцеля - рэволюцыянера Н. Чэрнышэўскага.

Цікава зарэкамендаваў сябе ў гістарычным жанры ленінградзец П. Сураўцэў. Яго карціна «Упершыню аб самалёце» паказвае адзін з эпізодаў зараджэння самалётабудавання ў Расіі. Ля стала, на якім раскладзены схемы і чарцяжы, а таксама мадэль будучага самалёта, — Мендзелееў і Мажайскі, поўныя веры ў перамогу думкі аб заваяванні паветраных прастораў. Карціна вылучаецца добрай кампазіцыяй і жывапіснай каляровай танальнасцю.

А. Раманычэў (Ленінград) удала знайшоў вырашэнне складанай тэмы, якая раскрывае гады бурнага разгортвання калектывізацыі. Яго палатно «Прыезд дваццаціпяцітысячніка ў вёску»—адно з лепшых на выстаўцы.

Цеплынёй і гумарам сагрэта работа кіяўлянкі А. Горскай «Санітарная камісія». Любоў да працы, дапытлівасць фабзавучнікаў паказаў О. Бетэхцін у карціне «Маладыя кадры». Тып бюракрата выведзены ў рабоце В. Макатухі «Апошняе папярэджанне». Вялікай вартасцю вылучаюцца работы Н. Смоліна (Харкаўскі інстытут) «На Каме», Р. Тухватуліна «Пасля выступлення», В. Кузняцова «На ўмацаванне калгаса».

На высокім прафесіянальным узроўні знаходзяцца графічныя работы. Тут трэба адзначыць афорты на тэму вызваленчай барацьбы ўкраінскага народа супраць польскай шляхты Л. Данчанкі (Кіеў). У гэтай-жа тэхніцы выканання вылучаюцца работы М. Шаніна «На Каме», ілюстрацыі В. Каняшэва да «Дзяцінства» М. Горкага, Л. Матвеева — да рамана В. Лаціса «Да новага берага», М. Сасаяна — да кнігі Туманяна «Гікор».

Выразнасцю вылучаюцца плакаты В. Карамзіна «Нас партыя вядзе», О. Паўлоўскага «Зашуміць тут жыта буйным коласам» і «Лес — дзяржаве», А. Вораны «Гультай ў арцелі, як язва на здаровым целе», С. Забалуева «Няхай жыве непарушная дружба народаў нашай краіны».

На выстаўцы экспанавана нямала ўдалых эскізаў дэкарацый і касцюмаў — Ю. Матвеева да оперы Т. Хрэннікава «У буру», Ф. Ахмедава да драмы Д. Джабарлы «У 1905 г.».

В. ЖДАН.

На здымку: наведвальнікі выстаўкі ў зале жывапісных работ.

Фото **І. Салавейчыка.**

Шасцідзесяцігоддзе В. А. Раждзественскага

18 красавіка спаўняецца 60 год з дня нараджэння паэта і перакладчыка Всевалада Александравіча Раждзественскага.

Першая яго кніга вершаў «Лета» з'явілася ў 1921 годзе. З таго часу Вс. Раждзественскі выпусціў у свет 14 кніг вершаў, з якіх трэба назваць «Залатое верацяно», «Вялікая мядзведзіца», «Гранітны сад», «Зямля, якая спявае», «Зямное сэрца», «Акно ў сад» і пасляваенныя зборнікі «Голас Радзімы», «Ладага» і «Родныя дарогі».

Вс. Раждзественскім напісана некалькі оперных лібрэта, сярод якіх найбольш вядома лібрэта оперы «Дзекабрысты». Яму належаць пераклады раду твораў Беранжэ, Гюго, Верхарна, Гётэ, Гейнэ.

Значнае месца ў творчасці Вс. Раждзественскага займае работа над перакладамі твораў брацкіх совецкіх літаратур. Ён пераклаў на рускую мову многія вершы Я. Купалы, Я. Коласа, П. Глебкі, М. Танка, П. Панчанкі, М. Лужаніна, М. Калачынскага, А. Вялюгіна і іншых беларускіх паэтаў.

У дзень шасцідзесяцігоддзя Вс. Раждзественскага ў Ленінградскім Доме літаратараў імя В. Маякоўскага адбудзецца вечар, прысвечаны яго жыццю і творчасці. Праўленне СП БССР паслала юбіляру прывітанне ад беларускіх пісьменнікаў.

П. КАБЗАРЭЎСКІ.

Вокны сатыры

У цэнтры Клічава, ля гарадскога парку, стаіць прыгожа афармлены стэнд з надпісам «Вокны сатыры». Ля стэнда заўсёды можна пачуць ажыўленыя размовы калгаснікаў, рабочых, інтэлігенцыі, служачых, якія абмяркоўваюць змешчаныя матэрыялы, выказваюць свае думкі і меркаванні. Здаецца, яшчэ зусім нядаўна «Вокны сатыры» былі ў раёне рэдкай з'явай, а цяпер у кожнай з трох МТС, амаль ва ўсіх калгасах, на прадпрыемствах, у хатах-чытальнях і сельскіх клубах выпускаюцца падобныя газеты.

Рэдкалегія многа працуе над тэмай кожнага малюнка і над подпісамі, каб яны былі больш дасціпнымі, трапнымі. Мастак тав. Крыловіч з густам стварае малюнкі на мясцовыя тэмы.

Баявыя вострыя сатырычныя газеты выходзяць у калгасах «Прагрэс», «Кастрычнік», «Комсамолец» і іншых сельгасарцелях раёна. Яны выкрываюць парушальнікаў дысцыпліны, лодараў і г. д. Газеты за кароткі час заваявалі шырокую папулярнасць у калгаснікаў.

Цяпер у Клічаве на стэндзе вывешаны чарговы, трынаццаты нумар газеты «Вокны сатыры». Матэрыялы ў ім прысвечаны падрыхтоўцы да веснавой сяўбы калгасаў і МТС раёна.

Крытычныя матэрыялы «Вокан сатыры» неаднаразова абмяркоўваліся на пасяджэнні бюро райкома партыі. Работнікі раённага аддзела культуры разам з рэдакцыяй райгазеты на нарадах работнікаў хатчыталенъ, клубаў, бібліятэк расказвалі аб вопыце работы рэдкалегій сатырычных газет.

Х. ЛІУШЫЦ,
рэдактар Клічаўскай раённай газеты «Сталінская праўда».

З ЗАМЕЖНАЙ ПОШТЫ

У змаганні за праўдзівае слова

У цяжкіх умовах расце і змагаецца амерыканская прагрэсіўная літаратура. Буржуазныя выдавецтвы і кнігагандлёвыя трэсты робяць усё, што ад іх залежыць, каб прагрэсіўная кніга не трапіла да чытача. Кнігі гэтых пісьменнікаў не прымаюцца для продажу камерцыйнымі магазінамі і кніжнымі агентамі.

Ставячы ўсялякія перашкоды ў справе распаўсюджвання літаратуры, якая змагаецца за мір, за сапраўдную дэмакратыю, за дружбу народаў, амерыканская буржуазія стараецца запалохаць прагрэсіўных пісьменнікаў. Але самае страшэннае для літаратара, калі яго пазбаўляюць магчымасці друкавацца. Таленавіты пісьменнік Макуэл Бодэнгейм, аўтар раду раманаў з жыцця н'ю-йоркскай беднаты, быў даведзены да галечы і памёр у трушчобах ад голаду. Аднак трэба адзначыць, што Бодэнгейм недастаткова быў звязаны з перадавымі коламі амерыканскай грамадскасці, ён заставаўся адзінокім, і таму такі сумны яго лёс.

Адзін з таленавіцейшых сучасных паэтаў Вальтэр Левенфельс пасля выдання сваёй кнігі «Галасы з Карэі», якая выкрывае вайну, быў кінуты ў турму.

У сваёй новай кнізе «Галасы са зняволення» паэт тонка, у паэтычных вобразах, поўных глыбокай іроніі, выкрыў сістэму паліцэйскага вышуку, пануючага ў палітычнай турме. Той-жа тэме прысвяціла і серыю нарысаў пісьменніца Рэгіна Франфельд, якая таксама была зняволена. У сваіх нарысах, аб'еднаных у кнігах «Пісьмы да дачкі» і «Мае дні ў турме», яна расказала аб жаночай палітычнай турме, адміністрацыя якой, каб зламаць волю зняволеных жанчын, ужывае агідныя правакацыйныя прыёмы, аж да ілжывых паведамленняў аб смерці родных і блізкіх арыштаваных.

У выключна цяжкіх умовах даводзіцца працаваць і тым прагрэсіўным пісьменнікам, якія знаходзяцца на волі. Іх імкнуцца ўсяляк ізаляваць не толькі ад чытачоў, але і ад сабратоў па пяру. Літаратура, якая змагаецца за мір і дэмакратыю, небяспечная для амерыканскай рэакцыі. Калі-б была магчымасць сапраўднай свабоды творчасці, прагрэсіўныя пісьменнікі, вядома, іграліі-б вядучую ролю ў амерыканскай літаратуры. Яны маглі-б знайсці нямала саюзнікаў сярод тых пісьменнікаў, якія фармальна не належаць да прагрэсіўнага лагера. Многія з гэтых пісьменнікаў незадаволены амерыканскай рэчаіснасцю, але крытыкуюць яе з аглядкай. Характэрна, напрыклад, з'яўленне цэлай серыі гістарычных раманаў, і асабліва п'ес, прысвечаных мінуламу Амерыкі — пераважна XVII і XVIII стагоддзям. У гэтых творах малюецца праследаванні іншадумцаў, пурытанскае двудушніцтва. Паколькі справа ідзе аб далёкім мінулым, да пісьменнікаў цяжка падкапацца. А ўжо справа чытача зразумець, што і цяпер ніколькі не лепш... Аб сённяшнім дні гэтыя пісьменнікі (драматург Артур Мюлер, негрыцянскі буржуазны пісьменнік Уільям Брант і інш.) не пішуць. Яны баяцца. У іншых умовах уплыў прагрэсіўных пісьменнікаў на гэтых літаратараў мог-бы быць плённым. Але з-за тэрору амерыканскай імперыялістычнай буржуазіі прагрэсіўнай літаратуры цяжка шукаць новых саюзнікаў.

У адрозненне ад сарамлівай крытыкі рэчаіснасці некаторымі амерыканскімі пісьменнікамі, прагрэсіўная літаратура гаворыць поўным голасам і называе рэчы сваімі імёнамі. Значны ўплыў робіць прагрэсіўная літаратура і на сумежныя мастацтвы. Ужо ў гэтым годзе з'явілася на амерыканскай сцэне опера кампазітара Меноці «Святая з Бекль-стрыта», сцэнарый якой напісаны прагрэсіўнымі пісьменнікамі К. Джэрамам і Рэквелем Кентам. У ёй бічуецца расавая няроўнасць і рэлігійнае ханжаства. Опера заклікае да барацьбы. Яна ставілася на сцэне ў Чыкаго, Філадэльфіі, Пітсбургу, Сан-Францыско і іншых гарадах.

Велізарным поспехам у гледача карысталася прагрэсіўная кінокарціна «Соль зямлі». Цяпер зняты новы фільм па сцэнарыю пісьменніка Будзі Шулберга «Бой ля вады», прысвечаны барацьбе докераў за мір і народныя правы. У другой карціне «Уцякач» паказаны шкодны ўплыў на дзяцей славутых «коміксаў». Прагрэсіўныя літаратары пачынаюць пранікаць у кіно, у гэту «святую святых» амерыканскага буржуазнага мастацтва. Таленавіты публіцыст Говард Лаусан у сваёй новай кнізе «Кіно ў барацьбе ідэй» паказаў класавую барацьбу, якая адбываецца ў амерыканскім кінематаграфічным мастацтве.

У 1954 годзе ў рады амерыканскіх прагрэсіўных пісьменнікаў прыйшло нямала новых таленавітых аўтараў. Вялікай папулярнасцю карыстаецца раман маладога пісьменніка Філіпа Баноскага «Даліна, якая гарыць». Гэты раман прысвечаны паказу жыцця і быту рабочых штата Пенсільванія. Баноскі паказвае ў сваім рамане першую забастоўку гэтых рабочых. Герой рамана малады рабочы Бенедыкт Бульманіс, які раней марыў стаць папом, паступова пачынае прымаць удзел у рэволюцыйнай барацьбе. Перажыванні яго адлюстраваны з вялікай псіхалагічнай глыбінёй. Раман паказвае, як амерыканскія комуністы ва ўмовах жорсткага прыгнёту вучаць адсталыя масы рабочых змагацца і перамагаць. Вобраз комуніста Дарвіка з'яўляецца адным з найбольш удалых у рамане.

У канцы 1954 года выйшаў таленавіты раман другога маладога пісьменніка Ларса Лаўрэнса «Заўтра апоўдні і ноччу». Гэта раман аб жыцці шахцёраў-мексіканцаў у штаце Н'ю-Мексіка. Галоўныя героі рамана — профсаюзныя дзеячы Артуро Фернандэц і Рамон Арц. Аўтар паказвае іх барацьбу за згуртаванне рабочых мас. Аўтар намаляваў вельмі яркія сатырычныя фігуры лютых ворагаў рабочага класа. Для таго, каб пасадзіць за краты перадавых рабочых, яны ўжываюць падлог, наймаюць ілжэсведак, плятуць павуцінне здрады і ашуканства. Яны імкнуцца скарыстаць мяшчанскія настроі адсталых рабочых. Прагрэсіўная прэса ўказвала, што вобразы гэтага рамана асабліва тыповыя для сучаснай амерыканскай рэчаіснасці.

Таленавіты журналіст Артур Кан упершыню выступае як раманіст. У сваім рамане «Буры камень» ён паказаў норавы н'ю-йоркскага дна, малюючы начлежкі ва ўсходніх бяднейшых раёнах гіганцкага горада. Аб'едноўваюцца для барацьбы людзі, якія гавораць на розных мовах. «На ўсіх мовах можна змагацца за чалавецтва», — заўважае адзін з герояў рамана Сек Вест.

Серыя новых апавяданняў аднаго са старэйшых амерыканскіх прагрэсіўных пісьменнікаў Майкла Голда малюе рост маленькага чалавека, загнанага, забітага, які пачынае ўжо самастойна мысліць. Цэлая серыя вобразаў мяшчан, што пачынаюць па-новаму жыць, праходзіць у яго зборніку апавяданняў «Пахаванне ў Блекберы». Драматург Дэвіс Берг у сваёй п'есе «Матухна Рыва» паказаў, як барацьба за мір захапляе простых жанчын сярэдняга класа, якія да апошняга часу былі заняты толькі сваімі хатнімі і сямейнымі справамі.

У амерыканскага гледача вялікім поспехам карыстаецца драма Барыса Стэвіса «Чалавек, які ніколі не памрэ». Гэта п'еса аб жыцці і барацьбе Джо Хіла, папулярнага ў Амерыцы пролетарскага паэта і песенніка, палымянага барацьбіта за справу працоўных, пакаранага смерцю ў 1915 годзе. «Гэты чалавек ніколі не памрэ», — так гаварылі прамоўцы на яго магіле. Песенькі і вершы Хіла заклікалі працоўных да барацьбы за мір, за народнае шчасце. Джо Хіл быў у свой час абвінавачаны ў крымінальным злачынстве, якога ён, вядома, ніколі не рабіў. Каб забіць «небяспечнага» народнага песняра, амерыканская буржуазія і ў старыя часы ўжывала ілжэсведак і падлог. Гісторыя, такім чынам, паўтараецца. І разам з тым, гэтая п'еса гаворыць аб традыцыях амерыканскага перадавога мастацтва, аб тым, што яно і ў мінулым выказвала думкі і надзеі народа.

Рэакцыйныя амерыканскія колы заўсёды крычаць, што яны «сапраўдныя амерыканцы». У адпаведнасці з гэтым усяляк фальсіфікуюцца старая амерыканская культура, амерыканскае мастацтва. Рэакцыянеры імкнуцца ўявіць сябе носьбітамі «амерыканскіх традыцый». Усялякая прагрэсіўная думка, гавораць яны, гэта нешта наноснае, чужое. Вось чаму для амерыканскай прагрэсіўнай літаратуры надзвычай важна раскрыць перадавыя прагрэсіўныя традыцыі амерыканскай культуры ў мінулым, паказаць, што гэтыя традыцыі заўсёды былі значнымі, што рэакцыянеры і імперыялісты не маюць права гаварыць ад імя амерыканскага народа. Невыпадкова з'яўленне ў 1954 годзе ў часопісе прагрэсіўных амерыканскіх пісьменнікаў «Мэсіс энд майнстрым» раду артыкулаў, прысвечаных выдатным амерыканскім пісьменнікам і мастакам мінулага. У сваіх крытычных артыкулах Герберд Аптэкер, Самуэль Сілен, Чарльз Гумболь, Елен Лазарус і іншыя ставяць пытанне аб сапраўдных традыцыях амерыканскай культуры.

Гэтая тэма пастаўлена і ў новым рамане Говарда Фаста «Сайлас Тымбермен», які з'яўляецца выдатным творам амерыканскай прагрэсіўнай літаратуры нашых дзён.

Палітычнае праследаванне сумленных людзей, незвычайна далёкіх ад актыўнай палітычнай дзейнасці, стала ў Амерыцы звычайнай з'явай. Гэтую тэму вымушаны закранаць цяпер і буржуазныя пісьменнікі. Напрыклад, ужо ў 1955 годзе ў н'ю-йоркскіх тэатрах пастаўлена п'еса Жоржа Белока «Бунтаўшчык», у якой студэнт Героці абвінавачаны ў тым, што ён выконваў на адным з канцэртаў творы... «большэвіка» Чайкоўскага.

Прагрэсіўныя пісьменнікі па-сапраўднаму паказалі разгул рэакцыі. У рамане Джо Дэйса «Гэта адбываецца ў Вашынгтоне» неадукаваныя шпікі з палітычнай паліцыі, уварваўшыся ва ўтульную кватэру дзяржаўнай служачай Файт Вайс, прымаюць бюст Моцарта... за Карла Маркса. У многіх творах закранаюцца пытанні, звязаныя з палітычным ганеннем радавых беспартыйных інтэлігентаў, далёкіх ад палітыкі.

Гэтая тэма, вядома, з вялікім майстэрствам і псіхалагічнай глыбінёй раскрыта Фастам у яго новым рамане. У адрозненне ад рамана Дэйса героі Фаста не дзяржаўныя чыноўнікі, а вучоныя, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, людзі вышэйшай духоўнай культуры. У адрозненне ад Дэйса Фаст не толькі паказвае палітычны прыгнёт, ён ставіць пытанне аб сапраўдных шляхах амерыканскай культуры, аб лёсе амерыканскай інтэлігенцыі. У гэтым значэнне рамана Фаста.

Трэба адзначыць, што абодва гэтыя раманы адкрылі шлях прагрэсіўнай літаратуры да масавага чытача. Упершыню творы прагрэсіўных пісьменнікаў кваліфікуюцца буржуазнай крытыкай як «бест селеры» (папулярныя кнігі). І гэта, вядома, невыпадкова. Яно адбываецца таму, што раманы Дэйса і Фаста цікавяць кожнага амерыканца. Бо кожны амерыканец, нават далёкі ад палітыкі, можа аказацца аб'ектам палітычнага праследавання. Абодва гэтыя раманы выйшлі ў краінах Паўднёвай Амерыкі, у Канадзе і ў радзе еўрапейскіх краін.

У выключна цяжкіх умовах змагаюцца амерыканскія прагрэсіўныя пісьменнікі за свабоднае, праўдзівае слова. Велізарныя цяжкасці стаяць на шляху амерыканскай прагрэсіўнай літаратуры. Але рост гэтай літаратуры бясспрэчны. Яе не палохаюць ні арышты, ні забароны. Прагрэсіўная літаратура паступова завяёўвае чытача, бо ў ёй адлюстраваны думкі і спадзяванні шырокіх мас амерыканскага народа.

І. БАРЫСАЎ.

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Дзмітрый АРЛОЎ, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЁЎ, Барыс ПЯРКОЎСКІ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

АТ 03400. Друкарня «Чырвоны друкар». Мінск, Рэволюцыйная, 12.